Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАУЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ І ЎПРАУЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 17 | 11 красавіка 1939 года, аўторак | Цана 20 кап.

ВЯЛІКІ ПІСЬМЕННІК ЯЎРЭЙСКАГА НАРОДА

Уся совецкая грамадскасць адзначае 80-годдзе з дня нараджэння класіка яўрэйскай літаратуры, аднаго з найвялікшых гумарыстаў, — Шолам-Алэйхема.

Шолам-Алэйхем з'яўляецца любімейшым пісьменнікам свайго народа. Яго чыталі і чытаюць мільёны. Гэта сапраўды народны пісьменнік. У цяжкія часы царызма Шолам-Алэйхем сваімі выдатнымі кнігамі прымушаў народ смяяцца, забываць на час гора і галечу. У кнігах Шолам-Алэйхема яўрэйскі народ бачыў трагізм свайго становішча. Народ, чытаючы кнігі Шолам-Алэйхема, плакаў і смяяўся. Так расла любоў народа к свайму пісьменніку, вялікая незабыўная любоў, як вялік і незабыўны сам Шолам-Алэйхем.

Перад смерцю Шолам-Алэйхем завяшчаў:

«Дзе-б я ні памёр, хай мяне пахаваюць не паміж арыстакратаў, паважных людзей і багацеяў, а паміж простых рабочых-яўрэяў, сярод сапраўднага народа, каб помнік, які паставяць потым на маёй магіле, асвятляў простыя магілы вакол мяне і каб простыя магілы ўпрыгожвалі мой помнік так, як просты сумленны народ асвятляў жыццё свайго народнага пісьменніка».

Яны ўзбагачалі адзін другога: народ — Шолам-Алэйхема і Шолам Алэйхем — свой народ.

Варта ўспомніць толькі шолам-алэйхемаўскія вобразы, і перад намі паўстане жудаснае мінулае яўрэйскага народа. Вось збіён, чалавек паветра Менахем-Мендл, эбіёральны тып яўрэйскай дробнай буржуазіі. Усе яго планы рушацца, усе яго ляпятуценні аб цудоўных багаццях разбіваюцца ўшчэнт і ён прымушан кожны раз звяртацца да сваёй беднай Шэйне-Шэйндл за дапамогай. Адыход з мястэчка ў капіталістычны горад ніякага шчасця не дае яму. А вось Тэв'е-малочнік. На галаву гэтага яўрэя-працаўніка сыплюцца няшчасце за няшчасцем, але Тэв'е не трапіць аптымізму, і калі па ўказу царскага ўрада яго высяляюць з вёскі, у якой ён пражыў усё сваё жыццё, ён усё-ж не аддаецца смутку. Ён паўтарае словы дачкі Голд, якая знаходзіцца разам з мужамі рэвалюцыянерам у Сібіры: «Настануць лепшыя часы для ўсіх нас, і сонца асвеціць увесь свет».

А вось хлопчык Мотл — выдатны вобраз яўрэйскага хлопчыка з усімі яго дзіцячымі радасцямі і горам. Мотл таксама лятуценнік, як і многія іншыя героі твораў Шолам-Алэйхема.

Вакол гэтых трох асноўных вобразаў творчасці Шолам-Алэйхема згрупіраван рад іншых: вобразы жанчын, актораў, музыкантаў, рэвалюцыянераў і г. д. Незвычайна вялік дыяпазон творчасці Шолам-Алэйхема. Гэты вялікі пісьменнік-рэаліст нічога не выпусціў з-пад сваёй увагі. Усё яўрэйскае жыццё канца XIX і пачатку XX стагоддзя знайшло сваё тыповае мастацкае адлюстраванне ў яго творчасці. Усе сацыяльныя зрухі таго часу не прайшлі міма вачэй пісьменніка, ён жыў жыццём свайго народа, сваёй эпохі.

Шолам-Алэйхем пачаў сваё літаратурнае жыццё барацьбой супроць псеўданароднасці, супроць псеўдарэалізма, супроць бульваршчыны пісьменніка Шомера, навадніўшага яўрэйскі кніжны рынак сваёй фальшывай пісанінай. Шолам-Алэйхем выціснуў Шомера з кніжнага рынка сваімі сапраўды народнымі, сапраўды рэалістычнымі, праўдзівымі творамі.

Шолам-Алэйхем пісаў зразумела, даступна і глыбока. Вялікая прастата яго творчасці, вялікая яснасць яго твораў спалучалася з глыбінёй ідэйнага замыслу. Усе гэтыя якасці, якія характарызуюць вялікіх мастакоў, былі ўласцівы Шолам-Алэйхему.

Уся совецкая краіна адзначае юбілей вялікага яўрэйскага пісьменніка. Ён любімы ўсімі народамі СССР, творы яго перакладзены на многія і многія мовы.

У годы імперыялістычнай вайны, за год да сваёй смерці, Шолам-Алэйхем пісаў:

«Свет напярэдадні перабудовы. Народы будуць разарваны і народы адродзяцца. Сярод іншых і наш яўрэйскі народ убачыць шмат суцяшаючага, шмат радаснага. А дзе буду тады я? Мае вочы не ўбачаць вызваленага, расправіўшага плечы яўрэя. Ну, дык няхай хоць дажывуць да гэтага нашы дзеці».

І далей: «Я паміраю ад смагі, я п'ю ваду, — мора не хопіць для мяне. Дзякуй богу, я хоць апынуўся ў чужой краіне з вялікай сям'ёй і без усякіх сродкаў для існавання, але ўсё-ж застрахован — з голаду не памру, — я памру ад смагі. І гэта к дабру. Няхай не гавораць: Шолам-Алэйхем памёр з голаду. — фі, ад смагі лепш, арыгінальней. З голаду паміраюць многія яўрэі, ад смагі адзін Шолам-Алэйхем».

Шолам-Алэйхем не дажыў да нашых дзён, да тых дзён, аб якіх ён марыў, да тых дзён, у якія яго творчасць стала здабыткам шматмільённых свабодных народаў вялікага Совецкага Саюза. І калі фашысцкія варвары і пагромшчыкі, развіваючы свае расавыя тэорыі, знішчаюць усе культурныя каштоўнасці, заліваюць гарады і сёлы крывёю яўрэяў, чэхаў і іншых народаў, у краіне Советаў народы жывуць у дружбе і адзінстве, узаемна ўзбагачаюць сваю культуру і мастацтва. Юбілей Шолам-Алэйхема ў нашай краіне з'яўляецца яшчэ адным доказам вялікай дружбы народаў, доказам вялікай мудрасці ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Хв. ШЫНКЛЕР

НОВЫЯ ТВОРЫ

ПАЧЭСНЫ РЭЙС

П'еса Хв. Шынклера «Пачэсны рэйс» паказвае чыгуначную рабочую сям'ю, перадачу вопыту старых кадравікоў маладым чыгуначнікам і выкрыццё падрыўной дзейнасці ворагаў, якія рыхтавалі дыверсію ў часе манеўраў Чырвонай Арміі.

Ніжэй мы друкуем урывак з фінальнай карціны п'есы.

Пакой у кватэры Бірулі. На ложку ляжыць Сымон Вікенцьевіч з абвязанай галавой. Ля стала сядзіць Мішур. Ля ложка — Валя.

Валя (чытае газету). «Раніцай пяць германскіх бамбардыроўшчыкаў «Юнкерс» скінулі 60 бомб на Барселону. Ёсць разбурэнні, а таксама афяры сярод грамадзянскага насельніцтва»...

Уваходзіць Ганна Паўлаўна, ставіць на стол пакрыты сурвэткай паднос.

Біруля. Ох-хо... Багата крыві народнай праллецца. Яшчэ каб толькі свае гады, а то вунь, бачыш, італьянскія фашысты... нямецкія фашысты... Уся сусветная погань драпежная накінулася... А як народ змагаецца...

Мішур. Вось пра чыгуначнікаў мала нешта пішуць.

Валя. Учора якраз было ў газеце!

Біруля. Не чытаеш ты газет, Міхей Макаравіч. Чыгуначнікі там малайцы.

Ганна Паўлаўна. Усе? А няма такіх, як у нас некаторыя былі за палякамі заставаліся, паноў вазілі. (Выходзіць з пакоя).

Біруля. У пана Пілсудскага выслугоўваліся...

Мішур (ёрзае на стуле). Ты-ж ведаеш, Сымон Вікенцьевіч! Я хоць не ад'язджаў, але Пілсудскаму не служыў. Што ты мяне, тое, заўсёды папікаеш?

Біруля. А хіба я пра цябе сказаў? От, гарачка якая. Сталасці ў чалавека ніякай няма...

Мішур. Я-ж кажу...

Біруля. Я не кажу, і ты не кажы... (Прыслухоўваецца да паравозных гудкоў за сцэнай). Чуеш, Макаравіч? Ідуць эшалоны!

Мішур. Ідуць, Сымон Вікенцьевіч, ідуць. І багата-а. Адзін за адным. І па правай калеі, і па левай. Густа ідуць... Такая сіла вялікая!

Біруля. Наша сіла, Міхей. Сталінская. Сіла гэтая ўсіх гадаў на парашок сатрэ коламі сваімі. (Крануў галаву рукой). Баліць вось, здаецца, а нібы паразумнеў я праз Замылку, гада таго... Стаялі мы з табой, да прыкладу, за правым крылом, уперад глядзелі — на профіль дарогі, узад паглядалі — на састаў... А яно, выходзіць, пільна і ў бакі, ва ўсе бакі глядзець трэба. Хто побач цябе, хто вакол цябе. Стаяць трэба, як чырвонаармеец з вінтоўкай на пасту. Усюды і заўсёды. Тады ворагу пралазу не будзе... (Пауза).

Зноў загулі паравозы.

Біруля. Гудуць... Толькі мне ляжы-вылежвайся тут. Аварыйная машына... Чыстае гора! І паглядзець нават нельга...

Мішур. А ты, тое, слухай! (Гудуць паравозы). Бач, аркестра якая...

Біруля. От Жадана не чутно нешта... Як ён там? Такі рэйс... Абяцаўся не паскудзіць. Трымайся, Цімоша, з чэсцю...

Уваходзіць Петрык, жэстамі падзывае Валю.

Петрык. Ну?

Валя. Нічога... Газету чытаем... Бабка дзеда Міхея зноў падкалвала... А наш дзед жартуе...

Петрык. Няма гарачкі?

Уваходзіць Ганна Паўлаўна, пачынае хупенька прыбіраць у пакоі.

Біруля. Ну, чаго ўсхадзілася. Ты што там, Петрык, мармычаш?

Петрык. Нічога, дзядуля! Тут да цябе госць прышоў.

Біруля. Хто там такі?

Ганна Паўлаўна. Таварыш Грамовіч!

Біруля. А яны маўчаць... Чалавека ў хату прасіць трэба, а яны...

Петрык выбягае.

Ганна Паўлаўна. Ага! А, можа, тут вэрхал у хаце...

Біруля. Сама хіба і нарабіла...

Ганна Паўлаўна (пакрыўдзілася). Усё я... усё сама...

Біруля. Я сказаў не «сама», а «хіба сама»...

Уваходзяць парторг Грамовіч і Петрык.

Грамовіч. Добры дзень! (Паціскае руку Мішуру, Бірулю). Як маемся, Сымон Вікенцьевіч?

Біруля. Добра! Зусім добра. Не ведаю, як і дзякаваць... Вы ўсіх дактароў, можна сказаць, на ногі паставілі.

Грамовіч. Ну, Сымон Вікенцьевіч, якжа інакш... За ваша здароўе сам нарком, Лазар Майсеевіч, трывожыцца.

Біруля. Лазар Майсеевіч?

Мішур (устае). Таварыш Кагановіч?!

Грамовіч. Так, таварыш Кагановіч. Вялікую пашану мае ён да ўсіх чэсных, адданых нашай радзіме людзей. Вы заслужылі пашану наркома, Сымон Вікенцьевіч!

Біруля. Гэта такое, таварыш Грамовіч... Гэта такая ўвага... Мне, старому, нядошламу, можна сказаць...

Ганна Паўлаўна (намыкаецца нешта сказаць, слёзы радасці ёй перашкаджаюць).

Петрык нешта хуценька шэпча Валі.

Валя. Ды ну? Маніш!

Петрык. Ат... Табе і сказаць нічога нельга.

Грамовіч. Вось, Сымон Вікенцьевіч! (Дастае з кішэні тэлеграму). Тэлеграма наркома...

Біруля прыўзнімае галаву, усе слухаюць, Валя нецярпліва махае на Петрыка рукой.

Петрык. Не верыла, дык сама паслухай!

Грамовіч (чытае). «За дапамогу ў падрыхтоўцы маладых паравознікаў, за адданасць сацыялістычнаму транспарту абвяшчаю падзяку стараму кадравіку-машыністу Сымону Вікенцьевічу Бірулю і ўзнагароджваю яго значком «Пачэснаму чыгуначніку». Кіраўніцтву дэпо загадваю забяспечыць належны медыцынскі догляд параненаму ворагамі народа таварышу Бірулю. Стан здароўя яго паведамляць мне». Вось, Сымон Вікенцьевіч... Віншую з высокай узнагародай. (Паціскае руку).

Мішур. Ну, Сымон... (Азіраецца на Ганну Паўлаўну і таксама паціскае руку Бірулю).

Петрык і Валя прытуліліся да дзеда, дзед шукае табакерку.

Ганна Паўлаўна. Кінь ты хаця цяпер табаку гэтую сваю...

Грамовіч. Гэта яшчэ не ўсё. Слухайце далей (чытае): «Выдатніку вучобы піянеру Пятру Бірулю, які праявіў высокую свядомасць і дапамагаў свайму дзеду ў яго рабоце, абвяшчаю падзяку і ўзнагароджваю значком «Пачэснаму чыгуначніку».

Ганна Паўлаўна. Петрычак, унучак мой...

Грамовіч. Віншую цябе, Петрык! Да барацьбы за справу Леніна—Сталіна будзь гатоў!

Петрык (аддае салют). Заўжды гатоў!

Грамовіч. А пачэснаму чыгуначніку (паказвае на Петрыка) новае кіраўніцтва дэпо заказала форменнае адзенне. Зімовае. Каб цёпла было ў школу хадзіць і дэпо наведваць!

Ганна Паўлаўна. А, бацюхны! Я-ж яму рукавічкі цёплыя звязала (бярэ са стала).

Грамовіч. Рукавічкі? Вельмі добра. Мы пра рукавічкі якраз і не падумалі...

Усе смяюцца. Свісток паравоза Жадана за сцэнай.

Петрык. Прыехаў! (Кідаецца да дзвярэй).

Біруля. Гэта Цімошын паравоз!

Мішур. Жадан прыехаў!

Біруля прыўзнімаецца на ложку.

Грамовіч. А вы ляжыце. Сымон Вікенцьевіч! Гэта здароўю шкодзіць. Нічога. Ён сюды заскочыць. мы яго папярэдзілі...

Мішур. Яно праўда. тое... Я-ж кажу, ляжы, Сымон... Туды ты не дапнеш, а тут табе хвалявацца няма чаго. Лежучы не падгоніш...

Ганна Паўлаўна (кпліва — да Мішура, каб не чулі астатнія). Ага! Не падгоніш! Ты ўжо шмат пападганяў...

Мішур. Кхе-кхе... Я-ж, Ганна Паўлаўна... Я-ж, каб на карысць Сымону Вікенцьевічу.

Ганна Паўлаўна. У цябе заўсёды на карысць...

Мішур упрошваюча глядзіць на Грамовіча.

Грамовіч (выручае). Ганна Паўлаўна! Што я ў вас хацеў спытацца...

Ганна Паўлаўна. Калі ласка, таварыш Грамовіч!

Грамовіч. У вас кубак чаю гарачага будзе? Жадан, ведаеце, з дарогі...

Ганна Паўлаўна. А як-жа! Хіба я не разумею? Мне-ж Петрык сказаў, што ён проста з паравоза да нас завітае... Самавар пэўна заходзіцца ўжо там. Пайду, пагляджу. (Выходзіць).

Мішур (смялей). Кхе...

Біруля. Патупала старая? Ну, то ты, Міхей Макаравіч, не пужайся. Хоць яна ў мяне і ўскрутная, але баба ніштаватая... Механікава жонка, то розум мець павінна...

Мішур. Я-ж кажу...

Біруля. Зноў «я кажу»... Калі ты казаў?

Мішуру зноў ніякавата. Выручае Петрык, які ўскаквае ў пакой.

Петрык. Ідзе сюды. Ухх... (Запыхаўся, плюхнуў на стул, ледзьве можа вымавіць слова). Семячка прыняў паравоз і зараз павядзе другі эшалон... Ухх...

Ганна Паўлаўна (за сцэнай). Ну? Як?

Жадан (за сцэнай, узбуджана). Як Сымон Вікенцьевіч?

Усе паварочваюцца да дзвярэй. Імкліва ўваходзіць Жадан, ідзе на дыбках да пасцелі, бачыць вясёлыя твары, знікае яго заклапочанасць, ён беражна паціскае руку Бірулю, потым усім астатнім. За ім уваходзіць Ганна Паўлаўна, спыняецца ля парога.

Біруля. Ну, Ціма, як ехаў?

Жадан. Усё ў парадку, Сымон Вікенцьевіч!

Грамовіч. Заданне...

Жадан. Выканана!

Петрык і Валя падскакваюць і пляскаюць у далоні.

Петрык. Ну, і Цімафей Пятровіч!

Грамовіч. Раскажаш?

Жадан (усміхаецца). Мне і самому пахваліцца карціць, таварыш Грамовіч (падыходзіць бліжэй да ложка Бірулі).

Мішур (нясмела пазіраючы на Ганну Паўлаўну). Яно і то праўда...

Біруля. Расказвай, Цімоша!

Жадан. Ну, вось! Прыехалі мы да месца. Вёў я цягнік як мае быць, усё па заданню выканаў і прыбыў — цот у цот...

Біруля. Малайчына, Цімоша!

Жадан (не чуе, ён захоплен нядаўна перажытым). Ага... Злез я з машыны. А сэрца ў мяне нібы спявае. Хаджу з ключом ля дышлаў, аглядаю. Чую — ззаду: — «Хто тут механік?» — Я, — кажу. Ды павольна паварочваюся. Гляджу — ваенныя, камандзіры вышэйшыя, а спераду — складны такі, мужны, і зоркі ў яго залатыя на пятліцах... (Жадан заззяў усмешкаю, усе напружана падаюцца да яго. Біруля прыўзняўся з ложка). Усміхнуўся ён так, як бацька родны, мне. — «Дзякую, таварыш механік», — гаворыць: — «за ўдарную, крываносаўскую работу, за выдатнае выкананне баявога задання!» А я... а я... любыя мае... — «Служым Совецкаму Саюзу!» — кажу. І тут успомніў яго-ж, Клімента Ефрэмавіча, словы...

Петрык і Валя (разам). Варашылаў...

Жадан. І дадаю: — «А чыгунка — родны брат Чырвонай Арміі, таварыш народны камісар абароны!» І тут таварыш Варашылаў руку мне паціснуў...

Біруля. Цімоша...

Петрык і Валя пляскаюць у далоні, Ганна Паўлаўна, разняўшы рукі, ідзе да Жадана.

Заслона.

ЯКУБ КОЛАС

БССР

На шырокім раздарожжы
Між двух розных светаў
Лёг наш даўні край прыгожы,
Родны край Советаў.
Эй, таварышы, братва!
Будзем край наш вартаваць.
Глянь, па ўсёй нашай старонцы —
Ад Дзвіны да Пціччы —
Як жычліва свеціць сонца
У сталінскім абліччы.
З імем Сталіна ўпярод
Ідзе смела наш народ.
Уплылі нядоля, гора,
Ліха беззваротна,
Нам дарожанькі ў прасторы
Леглі, як палотны.
Куды поглядам ні кінь,
Многа ясных далячынь.
Змрочны Захад з чорнай ночы
Скрыва косіць вокам,
Як да шчасця люд рабочы
Ідзе звонкім крокам.
Ты, фашыст, не паглядай
І на край наш не ківай.
Мы трымаем на старожы
Вуха, зрок відушчы,
І начніц ліхіх, варожых
Не ўратуюць пушчы.
У нас чуткі вартавы,
Зоркі, смелы, баявы.
А палезе сіла ўражжа,
Не званая ў госці,
На парозе трупам ляжа,
Зложыць свае косці.
Ёсць у нас з чым ваяваць,
Знаем, чым пачаставаць.
Не цячы Дняпру і Сожу
Ў Нямецкае мора,
Не таптаць назе варожай
Нашых ніў, прастораў.
Беларускі наш фарпост
Лютым ворагам — пагост.

4 красавіка 1939 года.

ІЛЬЯ ЭЛЬКІНД

Сярожа

У садку сягоння вее сумам.
Талы снег чарнее ля вугла.
Ён ідзе з паношанаю сумай,
Лістаносец нашага сяла.

Размывае сцежкі слота-восень.
Першы снег вядзе сялом зіму.
Трэці год лісты Сярожа носіць,
Трэці год зайздросціць аднаму:

Кожны дзень сябры яго, сяброўкі
Рады ліст чаканы атрымаць,
А Сярожу нават і паштоўкі
Дваццацікапеечнай
Няма...

Але, вось, прышла ў сяло навіна.
Хіба мог паверыць хто спярша,
Што ў лісце сваім нарком
Гасцінна
У Маскву Сярожу запрашаў:

— Моў, табой акруга ганарыцца,
Ты ў нас—вядомы паштавы!

. . . .

Ад'язджаў на свята ў сталіцу
Да наркома сельскі кальцавы.

ЛЕНІН У 1918 ГОДЗЕ



У Менску дэманструецца выдатны мастацкі гісторыка-рэвалюцыйны фільм «Ленін у 1918 годзе». На здымку — кадр з фільма: камендант Крэмля Матвееў (засл. арт. рэсп. В. Ванін) расказвае **Ф. Э. Дзержынскаму** (арт. В. Маркаў) аб раскрытым ім загаворы супроць В. І. Леніна. Фотахроніка ТАСС.

ВЫСТАЎКА „ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ А. М. ГОРКАГА“

5 красавіка ў Менскім Доме Чырвонай Арміі імя Варашылава адбылося ўрачыстае адкрыццё перасовачнай выстаўкі «Жыццё і творчасць А. М. Горкага», арганізаванай музеем А. М. Горкага ў Маскве. Яркі і змястоўны даклад аб творчасці Аляксея Максімавіча зрабіў дырэктар Інстытута сусветнай літаратуры імя А. М. Горкага акадэмік І. К. Луппал. Потым госці—чырвонаармейцы, камандзіры Чырвонай Арміі і члены іх сямей прыступілі да агляду выстаўкі. Тлумачэнне давалі акадэмік І. К. Луппал і экскурсаводы музея.

Выстаўка складаецца з 18 стэндаў, на якіх размешчаны шматлікія фатаграфіі, гравюры, рэдкія экземпляры газет і кніг, копіі з рукапісаў, карціны і іншыя дакументы, асвятляючыя жыццё і творчасць вялікага пісьменніка і грамадзяніна.

На некаторыя дакументы нельга глядзець без хвалявання. Вось рад ілюстрацый і дакументаў, якія адносяцца да дзіцячых і юнацкіх год Аляксея Максімавіча. Псалтыр, па якім дзед Кашырын навучаў яго грамаце, кнігі, якімі ён захапляўся, — Пушкін, Гейне, Беранжэ, Сервантэс, Флабэр. Дом на Успенскім з'ездзе у Ніжнім-Ноўгарадзе (цяпер горад Горкі), у якім у маленстве жыў Аляксей Максімавіч. Вакол Алёшы «дробныя людзішкі квапнічалі, зайздросцілі, злаваліся, біліся і судзіліся». Цяжкая нястача і гора хутка прымусілі яго пайсці «у людзі».

Выстаўка знаёміць наведвальнікаў з цярністым шляхам маладога Горкага, з яго «гаспадарамі» — таўстагубым гандляром, казанскім булачнікам, якія добра далі зразумець Горкаму, што такое жыццё.

«Вы скажаце — марксіст! Так... таму, што так выдублена скура. Мяне марксізму навучаў лепш і больш кніг казанскі булачнік Сямёнаў», — прызнаецца Горкі ў адным пісьме.

А. М. Горкі пачынае вандраваць па Русі. Карту гэтых вандраванняў паказвае выстаўка. Тысячы кіламетраў пехатой. Вялікая разнастайнасць уражанняў. У рэзультаце — літаратурны дэбют у газеце «Кавказ» у Тбілісі. Першае надрукаванае апавяданне «Макар Чудра».

Арыгіналы газет «Нижегородский листок» і «Самарская газета», дзе Горкі супрацоўнічаў пад псеўдонімам «Іегудзііл Хламіда». Данясенне начальніка тбіліскага жандарскага ўпраўлення. Метэхскі замак, дзе быў заключан А. М. Горкі ў 1898 годзе. Літаратурны журнал «Жизнь» і аповесць «Фама Гардзееў». Знаёмства з Караленка, Чэхавым, Л. Н. Талстым.

1901 год. Горкі піша сваю славутую «Песню аб буравесніку». «Искра» № 13 ад 20 снежня 1901 года з артыкулам В. І. Леніна, у якім гаворыцца аб праводах Горкага з Ніжняга-Ноўгарада ў Крым. І зноў жандарскія «справы», шыфраваныя тэлеграмы, якія адлюстроўваюць непакой царскай алігархіі ад растучага аўтарытэту Горкага.

Горкі ў годы першай рускай рэвалюцыі. Раман «Маці» і гісторыя яго стварэння. Горкі на востраве Капры. Дружба з В. І. Леніным. «Яго (Леніна) адносіны да мяне былі адносінамі строгага настаўніка і добрага клапатлівага друга» (А. М. Горкі).

Цяжка апісаць у кароткай газетнай заметцы велізарнае багацце гэтай выстаўкі, усю разнастайнасць і каштоўнасць шматлікіх дакументальных экспанатаў, характарызуючых жыццё і творчасць геніяльнага пісьменніка. Асабліва багаты і насычаны велізарнейшымі падзеямі годы, праведзеныя Аляксеем Максімавічам у Совецкім Саюзе.

Выстаўка дакументальна сведчыць аб тым, што Горкі быў кіраўніком совецкай літаратуры, совецкай драматургіі, другам Чырвонай Арміі, патрыётам сацыялістычнай радзімы і змагаром супроць фашызма. Дакументы рысуюць велічную карціну любві геніяльнага пісьменніка да народа і любоў народа да свайго пісьменніка.

Апошнія стэнды... Смерць Горкага ад крывавых лап гнусных падонкаў чалавецтва — трацкісцка-бухарынскіх бандытаў. Развітанне народа з любімым пісьменнікам. Кнігі на ўсіх мовах свету, як неўміручы помнік геніяльнаму пісьменніку...

Наведвальнік адыходзіць ад стэндаў усхваляваны, узрушаны. Дзесяткі запісаў у кнізе водгукаў гавораць аб тым, што ўсе наведвальнікі выстаўкі падзяляюць гэтыя пачуцці. Вось што піша чырвонаармеец І. Галубчыкаў: «Хочацца такое цёплае, самае цёплае і мілае сказаць аб нашым вялікім пісьменніку, вялікім чалавеку Аляксею Максімавічу Горкім. Прагледзеўшы выстаўку..., я яшчэ больш адчуў сілу яго твораў, велізарную плённую працу, якую ён затраціў на карысць народа сваёй сацыялістычнай радзімы. На выстаўцы я быццам спаткаўся з жывым Горкім, слухаў яго пяшчотныя, задушэўныя словы, глядзеў яму ў твар і чыстыя вочы. Калі-б я мог пісаць вершы, я стварыў-бы аб Горкім лепшыя песні».

Выстаўка варта таго, каб яе ўважлівейшым чынам агледзелі і вывучылі рабочыя, студэнты, вучні, сацыялістычная інтэлігенцыя нашай сталіцы.

І. ПРАЎДЗІН.

МАСТАЦКАЕ АФАРМЛЕННЕ БЕЛАРУСКАГА ПАВІЛЬЁНА

У адным з памяшканняў б. сельскагаспадарчай выстаўкі ў Менску кіпіць напружаная работа. 12 жывапісцаў, графікаў, афарміцеляў пад кіраўніцтвам мастака Алтуф'ева заняты дэтальнай распрацоўкай і загатоўкай рысункаў, паводле якіх будзе заказан рад высокамастацкіх рэчаў для афармлення беларускага павільёна Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Распрацоўваюцца рысункі тканін і посцілак, якія будуць заказаны 20 лепшым ткачыхам БССР, у тым ліку вядомым майстрам ткання Марыі Ліпай, Сямашка, Серада, Чарнавус, Пішчык і інш. Усяго мяркуецца выткаць каля 180 метраў тканін.

Робяцца рысункі разьбы і інкрустацыі па дрэву для апрацоўкі светлавых праёмаў у столі павільёна і пілястр, рысункі для гравіроўкі хрустальнага шкла і мастацкага афармлення шкляных ваз з каляровай палівай і гравіроўкай. Заказ на 30 такіх высокамастацкіх ваз здадзен ужо Барысаўскаму шклозаводу. Майстры завода спаткалі заказ з вялікім энтузіязмам.

Адначасова выконваюцца эскізы панно для аддзела «Заможнасць і культура» і вядзецца дэтальная прапрацоўка эскізаў фрыза цэнтральнай залы. Для лепшай экспазіцыі дакументальнага матэрыяла экспанентаў мастакі БССР выязджалі ў калгасы.

ПАМЯЦІ ГОМЕЛЬСКІХ КОМУНАРАЎ

Памяці гомельскіх комунараў, мужна загінуўшых ад рук кулацка-эсэраўскіх бандытаў-стрэкапытаўцаў, прысвечана мастацкая выстаўка, арганізаваная Гомельскім Дзяржаўным гістарычным музеем.

Дадатны бок работы Гомельскага музея ў тым, што да ўдзелу ў выстаўцы прыцягнуты мясцовыя мастакі.

Увагу гледачоў асабліва прыкоўваюць работы мастакоў Чэшэйка і Шаўчэнка.

Мастаком Ішчэнка дадзен эскіз «Мабілізацыя партыйных сіл на барацьбу з мяцежам». Тэма вельмі сур'ёзная і добрая, але мастак з ёю не справіўся, відаць выключная слабасць рысунка. Эскіз тав. Шаўчэнка на гэтую-ж тэму мацней па выкананню. Эскіз мастака Юшчэнка «Абарона гасцініцы «Савой», на маю думку, гістарычна няправільны. На «Савой» наступала не 5—6 мяцежнікаў, і гомельскія комунары абаранялі Совецкую ўладу не ад 5—6 чалавек, як паказана мастаком, а ад двух мяцежных палкоў. Эскіз тав. Мальца «Разгром кватэры стрэкапытаўцамі» не пераканаўчы. Незразумела, грабёж гэта ці вобыск. Не паказана таго, што было ў сапраўднасці: як п'яныя бандыты-стрэкапытаўцы здзекваліся з працоўных горада Гомеля.

Тэме «Зверствы стрэкапытаўскіх банд» прысвечаны два эскізы мастакоў Кусціна і Звенігародскага. Выкананне-ж і рысунак гэтых работ вымагаюць жадаць лепшага. Мастакі яшчэ слаба валодаюць рысункам.

Добра зроблен мастаком Чэшэйка эскіз «Вынас цел комунараў з Дома партактыва». Хацелася-б толькі, каб ясней быў выяўлен рысунак.

Пажадана было-б бачыць на выстаўцы не толькі эскіз, але і карціны. Нажаль, іх няма.

На выстаўцы ёсць каштоўныя дакументы аб тым, як гомельская партыйная арганізацыя геараічна змагалася супроць ворагаў народа, за вялікую, непераможную справу Леніна — Сталіна.

Н. П.

Гомель.

1859—ШОЛАМ-АЛЭЙХЕМ—1939

* * *

ШОЛАМ-АЛЭЙХЕМ АБ СВАІМ ГУМАРЫ

Шолам-Алэйхем, як кажуць, нарадзіўся гумарыстам. Яго гумар выявіўся вельмі рана, яшчэ ў маленстве. Але як у маленстве, так і ў наступныя годы, калі ён быў ужо славутым пісьменнікам, мала хто зразумеў і правільна ацаніў гэту яго «хваробу».

Калі Шолам-Алэйхем напісаў серыю фельетонаў «Увесь Бердзічаў», у габрэісцкай газеце «Гамейліц» паявіўся рад выпадаў супроць яго. Адзін «журналіст» заступіўся за гонар свайго горада і лаяў Шолам-Алэйхема за тое, што ён «высмейвае» яўрэйскія гарады, іранізіруе над яўрэйскім жыццём. Другі пісака з гэтайжа газеты заявіў, што Шолам-Алэйхем смяецца таму, што яму, напэўна, добра жывецца.

У сваім незакончаным апавяданні «Сярод мерцвякоў» Шолам-Алэйхем дае адказ на гэтыя папрокі. Сваё апавяданне «Сярод мерцвякоў», тлумачыць Шолам-Алэйхем, ён напісаў з прычыны таго, што яму забараняюць высмейваць жывых, і ён прымушан пайсці на могільнік «блукаць сярод мерцвякоў». Шолам-Алэйхем звяртаецца да «журналіста» з «Гамейліца»:

«Мілы друг! Ды прыбавіцца нам абодвум тое, чаго мне нехапае, але клянуся Вам чэсцю — нашто хаваць? У мяне, не пра Вас будзь сказана, такая хвароба з маленства яшчэ. Мне смешна, я не вінават! Меў-бы я столькі год шчаслівых, колькі аплявух атрымаў я за гэта ад бацькі, маці і рэбэ. Аднойчы напаў на мяне смех, не дапамаглі ніякія малітвы; чым больш мяне білі, тым больш я смяяўся. Аднойчы бацька збіў мяне да крыві, ён гаварыў, што цяпер раз і назаўсёды ён павінен выбіць з мяне гэты смех! Ледзь жывым вырвала мяне маці з яго рук і сказала мне:

— Гора мне, гора мне, я табе дам параду, маё дзіця: калі на цябе нападзе гэты смех, ты падумай аб мёртвых. І гэта мяне выратавала.

Я і цяпер падумаў: нашто мне блукаць сярод жывых, гледзячы на якіх можна памерці са смеху, лепш я пайду ўжо на могільнік блукаць сярод мёртвых».

У радзе пісем Шолам-Алэйхем адзначае гэту сваю «хваробу», ад якой ён не бачыць сабе паратунку. У 1903 годзе ён піша ў адным пісьме, што «наогул крыўдна, чаму нашы чытачы не хочуць разумець гумару, ненавідзяць сатыру! Што зробіш... якім-бы сюжэт ні быў бясконца сумным, тыя вобразы, якія бачу я плачучымі, наводзяць на мяне смех. Чырвоны Бэра, якім-бы ён ні быў няшчасным, Генех-халасцяк, якім-бы ён ні быў няўдачнікам, — атрымоўваюцца ў мяне жвава-весела! Колькі слёз (рэкі, патокі!) праліў-бы пры гэтым бедны Дынезон, якога я шчыра люблю за яго сумленнасць і святую наіўнасць у яго пісьменніцкай рабоце?

Што-ж мне рабіць, смех у мяне накшталт хваробы яшчэ з маленства. Першае, што ўбачыў я ў майго рэбэ, гэта яго мяккую барадаўку на носе, якую мне хацелася выцягнуць двума пальцамі, як выцягваюць рызінку. Першае, што мне кінулася ў вочы на твары жонкі майго рэбэ, гэта тое, што адно брыво ў яе было чорнае, другое — белае. Здавалася-б, што дробязь, — праўда? Але, калі я нядаўна сустрэў майго старага таварыша і напомніў яму аб рознаколерных брывах, я думаў, што таварыш мой сканае, — так ён смяяўся!»

Сапраўдны характэр гумару Шолам-Алэйхема, яго соцыяльная аснова і функцыя асабліва выражаны ў яго лепшых творах: «Закалдаваны кравец», «Тэв'е-малочнік», «Менахем-Мендл», «Хлопчык Мотка» і інш. Тут гумар Шолам-Алэйхема выяўляецца ва ўсёй сваёй шматграннасці і соцыяльна-рэалістычнай насычанасці. У гэтым гумары відаць блізкасць і спачуванне аўтара сваім героям, яго сумная мара і глыбокая вера ў лепшыя часы і ў здаровыя творчыя сілы народных мас.

Супярэчлівасць свайго гумару аўтар добра ўсведамляў і разумеў. Ён ведаў яго сапраўдныя прычыны і сэнс. Шолам-Алэйхем піша яўрэйскаму пісьменніку Дынезону:

«Вы-ж ведаеце мяне, што я не належу да ліку вялікіх песімістаў, я, калі не памыляюся, яўная супроцьлегласць Вам, Дынезон. Вы плачаце, і рыдаеце, і праліваеце слёзы, як бяроза, а ў канцы Вы заўсёды знаходзіце нейкае суцяшальнае слова, добрую надзею, і калі ад Вас выходзяць людзі, яны заўсёды ў добрым настроі, крыху размякчаныя, але здаволеныя, шчаслівыя, сагрэтыя, прыласканыя самым лепшым чынам. Я-ж, наадварот,—заўсёды ха-ха-ха і хі-хі-хі, жвава і весела, а мімаходзь укол, парапіна, часам уздых, слёзы і зноў — ха-ха-ха, і зноў хі-хі-хі. І калі ад мяне выходзяць, адчуваюць сябе, здаецца, крышку, таго-с... Я сабе ўяўляю, што чытач так разважае: вось гэта шэльма, у яго, здавалася-б, усё ў парадку, ці не так? Міласці просім, але калі даходзіць да самага галоўнага, вось чорт-бы яго пабраў!»

Тут Шолам-Алэйхем ужо ясна намякае на характар свайго гумару. Аўтар смяецца не для забавы. Ён сам калісьці войстра высмейваў тых псеўдагумарыстаў, павярховых жартаўнікоў, якія «сыплюць плоскімі славечкамі, бязглуздымі жартамі, грубымі глупствамі, як які-небудзь бадхан, маршалак, без праграмы, без мэты, без душы і цела, а проста жартамі, вульгарнымі славечкамі і парнаграфічнымі выразамі, як вандроўны шут выманьваючы 25 капеек у народа...»

Шолам-Алэйхем адносіцца з найвялікшай любоўю да маладых, сапраўды таленавітых гумарыстаў, чый гумар выцякае з самога жыцця. Аднačасова ён высмейвае тых танных «жартаўнікоў», якія самі называюць свае творы «гумарэскамі» і гэтым як-бы гавораць чытачу: «Смейся, нягоднік, інакш атрымаеш гумарэскай па галаве!»

У прадмове да першага тома сваіх твораў на рускай мове (1910 год) аўтар сам дае ключ для расшыфроўкі вялікай загадкі яго гумару. Ён указвае канкрэтныя крыніцы, з якіх жывіўся і чэрпаў свае сокі ягоны гумар. Ён піша: «Тыя супярэчнасці, якія сустракаюцца паміж воўкавымі ўмовамі жыцця «гетто» і чыстымі рухамі душы, ствараюць часам камічныя сітуацыі, выклікаючыя іншы раз ціхую ўсмешку, іншы раз гучны смех. І гэта з'ява дзе-ні-дзе прыпісваецца чытачамі не самому жыццю, якому яна ўласціва, а фантазіі жартаўліва настроенага пісьменніка...»

Вось тая жыццёвая аснова, на якую абапіраецца гумар Шолам-Алэйхема. Такія-ж і яго выказванні аб яўрэйскай народнай мове, якая на думку Шолам-Алэйхема таксама поўна гумару. А тагачасная яўрэйская мова жывілася канкрэтнымі ўмовамі жыцця таго-ж «гетто».

Шолам-Алэйхем намячае тры асноўныя крыніцы свайго гумару: першая—асабістая схільнасць усё бачыць гумарыстычна; другая — само жыццё яўрэйскіх народных мас, якое зрабіла гумар асноўным мастацкім сродкам крытычнага рэалізма пісьменніка; трэцяя — сама заканамернасць яўрэйскай народнай мовы, якую ён прыкмеціў і выкарыстаў. Яўрэйская народная мова ў творчасці Шолам-Алэйхема загучала зусім па-новаму.

І. СЯРЭБРАНЫ.

* * *



ЛЮБІМЫ ПІСЬМЕННІК, ВЯЛІКІ ПЯСНЯР

Шолам-Алэйхем, — гэта імя заўсёды выклікае выключнае пачуццё—пачуццё радасці і цеплыні. Ты ўспамінаеш хлопчыка Мотку, і прад табою паўстае тваё маленства: маленькае яўрэйскае мястэчка, абадраныя дзеці з кучаравымі галоўкамі (ёсць і такое апавяданне ў Шолам-Алэйхема —«Тры галоўкі»), якія мараць ужо аб нейкіх невераемных рэчах, аб нечым прываблівым, далёкім.

Потым паўстае прад табою Менахем-Мендл, гэты чалавек паветра, які марыў аб фантастычных багаццях. Ён кідаецца ў розныя бакі за сваім «яўрэйскім шчасцем» і нідзе не можа яго злавіць. Ён шукае гэта шчасце ўсюды, але нідзе яго не знаходзіць. Ён такі-ж фантазёр, як і тыя дзеці з кучаравымі галоўкамі. Шолам-Алэйхем знаходзіць для сваіх герояў смешныя і чуллівыя словы, ён іх проста вельмі любіць і знаходзіць для іх хоць якое-небудзь суцяшэнне.

Героі Шолам-Алэйхема рэальныя і разам з тым вялікія лятуценнікі. Вельмі звычайным было іх жыццё, і мара аб прывабнай будучыні прыносіла ім шмат радасці і суцяшэння. Шолам-Алэйхем гэта добра разумеў і вельмі тонка выкарыстаў у сваёй творчасці. І таму памыляюцца тыя, хто лічыць Шолам-Алэйхема толькі бытаапісальнікам. Ён ніколі не быў бытаапісальнікам, а як вялікі мастак заўсёды шукаў нечага большага, абагульняючага.

Шолам-Алэйхем—любімейшы пісьменнік свайго народа. Рэдка сустрэнеш у літаратуры такога пісьменніка, які быў-бы ў аднолькавай ступені даступным любому кругу чытачоў. Шолам-Алэйхема чыталі ўсе, увесь народ і кожны знаходзіў у ім сваё, блізкае, роднае, шолам-алэйхемаўскае. Ён ніколі не пакідаў сваіх герояў у поўным адчаі. І Тэв'е-малочнік пасля ўсіх сваіх няшчасцяў не падае духам, бо народ ніколі не падае духам, а Шолам-Алэйхем паказваў народ з такой любоўю, з такім лірызмам, як нямногія пісьменнікі.

Ён застаўся верным сабе і народу да апошняй мінуты свайго жыцця. І народ удзячан яму, і чым далей, тым больш расце да яго народная любоў. Бо кожны раз, чытаючы Шолам-Алэйхема, народ пазнае нанава сваё сумнае жыццё ў канцы XIX і пачатку XX стагоддзя.

З. АКСЕЛЬРОД.

СВЯТКАВАННЕ ЮБІЛЕЯ

Працоўныя БССР шырока адзначаюць 80-гадовы юбілей з дня нараджэння вялікага класіка яўрэйскай літаратуры Шолам-Алэйхема. У Менску, Віцебску, Гомелі, Магілеве, Барысаве, Бабруйску, і іншых гарадах праведзены вечары, прысвечаныя жыццю і творчасці выдатнага пісьменніка. Вечары гэтыя збіраюць шматлікую аудыторыю. У Оршы, напрыклад, на агульнагарадскім вечары замест запрошаных 800 чалавек прысутнічала звыш 1000. На вечар прышло шмат калгаснікаў з калгаса «Чырвоны Берагь».

З вялікім уздымам прайшоў вечар у Н-скай часці, дзе чырвонаармейцы, камандзіры і члены сямей праявілі да твораў Шолам-Алэйхема выключную цікавасць.

Ва ўсіх бібліятэках адзначаецца велізарны попыт на творы Шолам-Алэйхема. Кніжныя кіёскі на шолам-алэйхемаўскіх вечарах прадаюць звычайна на сотні рублёў літаратуры аб Шолам-Алэйхему.

* * *

З ДАКУМЕНТАЎ МІНУЛАГА

Тэатр для працоўных мас да Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі быў недасягальным.

У мястэчках мяжы яўрэйскай аселасці існавалі аматарскія гурткі, якія ставілі спектаклі, наладжвалі канцэрты і такім чынам мелі магчымасць развіваць свой талент. Ставіліся таксама спектаклі для патрэб мястэчка (напрыклад, на карысць вольна-пажарных таварыстваў, на карысць бедных і г. д.).

Але не лёгка было аматарскім гурткам атрымаць дазвол на пастаноўку. Ні спраўнік, ні губернатар не давалі дазволу.

У Менскім Дзяржаўным гістарычным архіве захоўваюцца матэрыялы, якія адлюстроўваюць тыя мытарствы, якія прыходзілася перамагаць яўрэйскім аматарскім гурткам, каб атрымаць дазвол на пастаноўку спектакля.

У 1903 годзе Ігуменскі павятовы спраўнік піша рапарт менскаму губернатару, што ў мястэчку Пухавічы без дазволу адбыўся аматарскі спектакль на яўрэйскай мове. За ўваход бралі плату на карысць бедных яўрэяў мястэчка Пухавічы. Збор даў 20 рублёў.

Канцылярыя губернатара зараз-жа адгукнулася на такую «важную» падзею і загадала спраўніку «прыцягнуць да законнай адказнасці асоб, наладзіўшых без дазволу аматарскі спектакль на яўрэйскай мове».

Распараджэнне губернатара было выканана.

У 1914 годзе жыхар мястэчка Давыд-Гарадка, памочнік начальніка давыдгарадоцкага вольна-пажарнага таварыства М. Рымар звярнуўся да менскага губернатара з наступнай заявай:

«Маю гонар пакорнейша прасіць ваша прэвасхадзіцельства дазволіць у м. Давыд-Гарадку пастаноўку спектакля на яўрэйскай мове (карціна з яўрэйскага жыцця ў 3-х дзеях, з твораў Шолам-Алэйхема, пад загалоўкам «Цузэйт ун цушпрэйт», г. зн. «У разброд»). Збор са спектакля, пасля пакрыцця расходаў па арганізацыі спектакля, прызначаецца на карысць давыд-гарадоцкага вольна-пажарнага таварыства. Спектакль будзе дадзен аматарамі, жыхарамі м. Давыд-Гарадка.

Праграма спектакля пры гэтым прыкладаецца.

21 мая 1914 года».

Губернатар не дазволіў ставіць п'есу Шолам-Алэйхема «У разброд», і спектакль не адбыўся.

Заява гр. Рымара была пададзена 21 мая, а 20 мая 1914 года Шолам-Алэйхем чытаў свае творы ў менскім купецкім клубе. Чытаў ён: «У доктара», «Лех-Лехо», «За парадай». Зала была перапоўнена і кожнае выступленне пісьменніка сустракалася авацыямі.

Але не лёгка было атрымаць дазвол на вечар Шолам-Алэйхема. Было пададзена пяць заяў розных імпрэсарыё і толькі на адну з іх быў атрыман дазвол.

Шолам-Алэйхем хацеў застацца яшчэ на адзін вечар, але губернатар забараніў.

Адмаўленне губернатара даць Шолам-Алэйхему дазвол на чытку яго твораў (30 мая 1914 года Шолам-Алэйхем павінен быў чытаць у Менску свае творы: «Бердзічэвер трамвай», «Мне добра, я сірата», «Малочныя прадукты», «Карты»), забарона ставіць п'есу Шолам-Алэйхема «У разброд» — сведчаць аб тым, што царызм баяўся Шолам-Алэйхема, вечары якога актыўна наведваліся працоўнымі.

Л. ДУШМАН.

ШОЛАМ-АЛЭЙХЕМ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Наш супрацоўнік звярнуўся да пісьменніка-ордэнаносца **Змітрака Бядулі** з просьбай паведаміць аб сваёй рабоце над перакладамі твораў Шолам-Алэйхема.

— Шолам-Алэйхема, — паведаміў тав. Бядуля, — я пачаў перакладаць яшчэ ў 1926 годзе. Пераклаў я тады аповесць з жыцця дзяцей яўрэйскага мястэчка — «Хлопчык Мотка». Гэта кніжка да 80-годдзя з дня нараджэння Шолам-Алэйхема выйшла трэцім выданнем.

Да юбілея выходзяць з друку ў маім перакладзе «Запіскі каміваяжора» і кніжка дзіцячых апавяданняў Шолам-Алэйхема, у якую ўвайшлі творы «Рабчык», «Гадзіннік», «На скрыпцы» і «Ножык».

Цяпер я працую над новымі перакладамі твораў Шолам-Алэйхема.

Шолам-Алэйхем — адзін з маіх любімых пісьменнікаў, ім я захапляўся яшчэ ў маленстве. Не гледзячы на цяжкасці перакладу, я працую над творамі Шолам-Алэйхема з вялікай любоўю. Мова Шолам-Алэйхема сакавітая, глыбока народная, аздобленая народным гумарам, прыказкамі і пагаворкамі, таму на беларускую мову перакладаецца параўнальна лёгка, бо і беларуская мова багата народнай мудрасцю і гумарам.

Я памятаю, што калі «Хлопчык Мотка» упершыню пачаў друкавацца на старонках нашых газет, беларускія сяляне, беручы гэтыя газеты з сабой у поле, чыталі аповесць з вялікай асалодай.

Шолам-Алэйхем, як сапраўдны народны пісьменнік, займае ў літаратурнай спадчыне нашага народа адно з самых ганаровых месц.

„ШОЛАМ-АЛЭЙХЕМ І ФАЛЬКЛОР"

Яўрэйскі пісьменнік І. А. Сярэбраны здаў Дзяржаўнаму выдавецтву БССР кнігу «Шолам-Алэйхем і фальклор» памерам у 12 друкаваных аркушаў. Кніга расказвае аб любві Шолам-Алэйхема да народа, аб адносінах пісьменніка да яўрэйскай народнай мовы, аб скарыстанні Шолам-Алэйхемам фальклору ў сваёй ранняй творчасці, аб крытычным рэалізме і народным гумары ў яго спелых творах.

У кнізе даецца паказ скарыстання Шолам-Алэйхемам фальклору ў творах «Менахем - Мендл», «Тэв'е - молочнік», «Хлопчык Мотка» і інш.

Аўтар робіць вывад, што любоў Шолам-Алэйхема да народа і яго глыбокі гуманізм знеслі ўсе перашкоды на шляху пісьменніка да рэалістычнай творчасці і дапамаглі яму знайсці самога сябе. Эвалюцыя Шолам-Алэйхема да рэалізма ішла побач з ростам яго зацікаўленасці да народнай творчасці. Ад стыхійнага да свядомага крытычнага рэалізма— вось шлях Шолам-Алэйхема ў паказе актуальных з'яў яўрэйскага жыцця. Такі-ж яго шлях да яўрэйскага фальклору: ад стыхійнай зацікаўленасці да асэнсаванага ўжывання штодзённай народнай мовы і скарыстання народнай творчасці.

Творчы вопыт Шолам-Алэйхема, яго шлях і эвалюцыя вельмі навучальны для нашай сучаснай совецкай літаратуры, якая выхоўваецца на высокіх ідэях народнасці і соцыялістычнага рэалізма.

П—Н.

Р. РУБІНА

ПРА АПОВЕСЦЬ „ХЛОПЧЫК МОТКА"

Аповесць «Хлопчык Мотка» была пачата Шолам-Алэйхемам у 1907 годзе. У гэты час былі ўжо амаль закончаны цэнтральныя творы геніяльнага пісьменніка—«Менахем-Мендл» і «Тэв'е-малочнік». Асноўныя ідэі гэтых твораў знайшлі сваё адлюстраванне і ў аповесці «Хлопчык Мотка».

Некаторых герояў аповесці «Хлопчык Мотка» аб'ядноўвае з Менахем-Мендлам, у першую чаргу, іх безгрунтоўе, пагоня за багаццем і нерэальнасць, ілюзорнасць іх прадпрыемстваў: іх вялікая вера ў лепшыя часы і яшчэ большыя правалы ва ўсіх справах.

Менахем-Мендл, дробны буржуа, які марыць аб прыстасаванні да капіталізма, кідае сваё патрыярхальнае мястэчка і становіцца тварам да новага капіталістычнага свету. Ён круціцца ў зачараваным крузе зманлівага шчасця і фактычных рэальных правалаў, маніякальнай пагоні за багаццем і фактычнай беднаты і падаўленасці. Ён асляплен мігценнем каруселі капіталістычных парадкаў, але сам знаходзіцца звонку і асуджан быць размолатым ёю.

У такім-жа становішчы знаходзяцца Эля і Піня і ўся местачковая арава з аповесці «Хлопчык Мотка». Але тут мы маем справу з аравай і ў гэтым істотная розніца паміж «Менахем-Мендлам» і «Хлопчыкам Моткам».

Калі Менахем-Мендл выбіраецца з мястэчка і яму супроцьстаўляецца яго жонка, местачковая Шэйне-Шэйндл з яе патрыярхальнымі ўяўленнямі, дык у «Хлопчыку Мотку» Шэйне-Шэйндл сама запакоўвае свае падушкі і ратонду і накіроўваецца ў дарогу. Яна таксама прымае актыўны ўдзел у пошуках шчасця.

У аповесці «Хлопчык Мотка» ёсць таксама кантраст паміж «людзьмі паветра» Элем і Пінем, з аднаго боку, і цвярозамыслячымі жанчынамі, з другога. Жанчыны заўсёды чымсьці нездаволены. Броха рэзка выказвае сваё нездаволенне Лонданам: «Лондан, чаму ты не згарыш?» Ёй не падабаецца незразумелая мова англічан, чужды ёй таксама лад жыцця ў Нью-Ёрку. Сваё нездаволенне ўсімі навінамі Броха часта выказвае, як і Шэйне-Шэйндл, народнай прыказкай, дзе ў крылатай форме закансервіравана патрыярхальнае ўяўленне аб жыцці. Не гледзячы на свае патрыярхальныя адносіны да акружаючага, тая-ж самая Броха захоплена ілюзіяй хуткага абагачвання («Патраціш рубель, заробіш сто»). Яна таксама, як і іншыя, намешана на тысячах бутэлек чарніла, на вялікіх бочках квасу, на поўных мяшках «шамерыцы». Менахем-Мендл ужо не з'яўляецца тут першай ластаўкай. Уся сям'я ўдзельнічае ў пошуках шчасця:

«Праца была падзелена паміж намі вельмі добра. Мая швагерка Броха паласкала бутэлькі і перадавала матцы. Маці аглядала кожную бутэльку паасобку і падавала мне ў рукі. Мне трэба было толькі ўстаўляць у бутэльку лейку і трымаць адной рукой бутэльку, а другой — лейку. Галоўную працу рабіў мой брат Эля: набіраў конаўкай з цэбра і цурболіў мне ў лейку. Праца вельмі цікавая і вясёлая».

Гэта не праца, а ілюзія працы, і прыбыткі ад яе не больш рэальныя, чым усе мерапрыемствы Менахем-Мендла.

У сваім творы «Менахем-Мендл» Шолам-Алэйхем паказаў тэндэнцыі распаду сям'і пры капіталізме. У аповесці «Хлопчык Мотка» Шолам-Алэйхем імкнецца паказаць цэласнасць патрыярхальнай сям'і. Гэта цесна звязана з асноўнай функцыяй твора — падбадзёрыць пакутуючы народ. Жыццё жорсткае, заработкаў няма, людзей гоняць з наседжаных месц, але... усё гэта адбываецца ў цёплай атмасферы, у атмасферы любімага Шолам-Алэйхемам «трэцяга класа». Жыве яшчэ тоўстая суседка Песя з захаваным для збяднеўшай сям'і кантара Пейсі гаршочкам смятаны; усё мястэчка цікавіцца яшчэ тым, ці добра Эля зашыў грошы, атрыманыя ім за прададзеную хатку; заўсёды заплаканая маці з'яўляецца яшчэ фактычнай прадстаўніцай сям'і ў розных эміграцкіх камітэтах.

У аповесці «Хлопчык Мотка» Шолам-Алэйхем выкарыстаў некаторыя ўлюбёныя ім прыёмы кампазіцыі, якія падкрэсліваюць асабліва войстра трагікамізм яго персанажаў. Гэта прыёмы, на якіх пабудована яго выдатнае апавяданне «Закалдаваны кравец».

У гэтым апавяданні расказваецца аб тым, як местачковы кравец звар'яцеў з-за казы, набытай ім у суседнім мястэчку. Багаты карчмар некалькі разоў абменьвае яго казу на казла і наадварот. Кравец мітусіцца паміж двума маленькімі мястэчкамі і трапляе кожны раз у карчму, якая знаходзіцца на сярэдзіне дарогі, дзе яго каза ператвараецца ў... «чорт ведае што». У гэтым кружэнні на адным месцы Шолам-Алэйхем бачыў ідыётызм местачковага жыцця. Ён паказваў у гумарыстычнай форме трагедыю гэтага ідыётызму, як рэзультат безгрунтоўнага існавання і жудаснай нястачы, як рэзультат жыцця ў вядомай яўрэйскай «мяжы аселасці».

Вось гэты заўсёдашні зварот героя да пачатку, да свайго выходнага пункту, падкрэслівае яго бясплоднасць і маніякальнасць. Чалавек балансіруе ўвесь час на адным месцы і думае, што перамагае прасторы. Гэта і стварае камізм вобраза і сітуацыі.

Ці не з'яўляецца ўкрадзеная пасцель у «Хлопчыку Мотку» той-жа казой, якая ператвараецца ў «містычную» істоту ў «Закалдаваным краўцу». Ці-ж гэта не тая бессэнсоўная дробязь, якая ператвараецца ва ўмовах няўстойлівага існавання ў фатальную?

У моўным коле, у патоку слоў, што ствараецца вакол украдзеных падушак, адлюстроўваецца адчай местачковага чалавека, яго разгубленасць у вялікім горадзе, няўменне адрозніваць істотнае ад неістотнага. Абываталь ператварае ў фецыш якую-небудзь бессэнсоўную дробязь і носіцца з ёю, як завараханы.

Залішняя разгаворчывасць з'яўляецца таксама выражэннем нелагічнасці мышлення. Героі «Хлопчыка Моткі» не могуць мысліць лагічна таму, што яны трапляюць у вельмі складанае для іх акружэнне, яны вісяць паміж небам і зямлёй, так што нават у сваёй мове яны не ідуць далей выходнага пункту.

Мы дазволім сабе прывесці цытату з вельмі характэрнага дыялага:

«—Ой, сватухна! Мне не меней трэба гаварыць аб сваіх падушках і падушачках, што ў мяне ўкралі на граніцы, а вы ўсё—ратонда ды ратонда!..»

На гэта пекарка Рыва кажа сваім грубым мужчынскім голасам:

— Хоць кажыце «не раўнуючы»!

На гэта ёй маці кажа:

— А ў мяне крадзеныя падушкі?

Рыва кажа:

— Крадзеныя, не крадзеныя, я пры гэтым не стаяла.

Маці кажа:

— Я не разумею, сватухна, што гэта ў вас за тон? Што гэта за гутарка?

Рыва кажа:

—Як гукнеш, так і адклікаюцца.

Маці кажа:

— Сватухна! Чым я зачапіла ваш гонар?

— Хто кажа, што вы зачапілі мой гонар?

Маці кажа:

— Дык прычым тут «не раўнуючы»!

Рыва кажа:

— Пэўна, не раўнуючы. Бо калі я гавару пра сваю ратонду, дык вы не павінны тыцкаць мне ў нос сваіх падушак і падушачак.

Маці кажа:

— Ці-ж у мяне крадзеныя падушкі?

Рыва кажа:

— Крадзеныя, не крадзеныя, я пры гэтым не стаяла».

Гэты дыялаг з'яўляецца тыповым прыкладам моўнага кружэння на адным месцы і нелагічнасці мышлення.

Такім чынам, залішняя разгаворчывасць з'яўляецца рэальнай рысай персанажаў Шолам-Алэйхема. Яна з'яўляецца славесным афармленнем няпоўнакаштоўнага жыцця і выцякаючых з гэтага жыцця ілюзорных інтарэсаў і ўяўленняў замест рэальных. У вобразе самога Моткі, як і ў вобразе Тэв'е, багацце мовы з'яўляецца лірычным сродкам, яно служыць для прыцягнення ўвагі к персанажу, для абуджэння жаласці к яму.

Кампазіцыя «Хлопчыка Моткі» не вычэрпваецца слоўнымі і сітуацыйнымі кругамі. «Менахем-Мендл» увесь пабудаван, як круг. Пісьменнік паказвае з вялікай паслядоўнасцю ўсе ўзлёты і падзенні свайго героя. У «Хлопчыку Мотку» кругападобнасць пабудовы змякчаецца формай сямейнай хронікі, якая як-бы заспакойвае і замаруджвае тэмп. Спакойная апавядальнасць стварае ўражанне, што яшчэ можа штосьці адбыцца, змяніцца, трэба толькі спадзявацца.

Аповесць «Хлопчык Мотка» уяўляе сабою разгорнуты маналог дзіцяці. Мяккі гумар Шолам-Алэйхема становіцца тут яшчэ больш лірычным, дзякуючы наіўнасці дзіцячай свядомасці. Мотка — гэта збіральны тып цэлага раду дзіцячых вобразаў Шолам-Алэйхема, але, у першую чаргу, ён з'яўляецца родным братам Шолама («З ярмарка»). Гэта, у значнай ступені, аўтабіяграфічны вобраз.

У вобразе Моткі Шолам-Алэйхем увасобіў творчыя сілы народа, яго імкненне вырвацца з пут рэлігійнага аскетызму і яго непахіснасць перад тварам няшчасцяў. Кніга-ж пачынаецца з жыццёрадаснага апісання таго, як Мотка скача з цялёнкам «Мені». Мотка поўны дзіцячай энергіі. Ён імітыруе смешных суб'ектаў, рысуе «чалавечкаў», скача па вуліцы і прадае квас, прымае актыўны ўдзел у чарнільным навадненні, ён чрэвавяшчацель, насмешнік і г. д. Мотка прымае ўдзел ва ўсіх прадпрыемствах свайго брата, але яны пазбаўлены для яго якой-бы то ні было практычнай цікавасці. Ад іх ліквідацыі ён атрымоўвае такое-ж здавальненне, як ад іх росквіту. Гэта толькі практыкаванні для дзіцячай энергіі.

Мотка з'яўляецца, у першую чаргу, назіральнікам. Яго войстрае дзіцячае вока фіксіруе ўсё акружаючае і па-дзіцячаму яго інтэрпрэтыруе. Камізм асобных вобразаў і сітуацый паказан у дзіцячым аспекце Моткі. Мотку дадзена наіўна апавядаць аб «весялосці» чарнільнага навадnення, аб чыхаючай вуліцы і нават аб няшчасцях эмігрантаў такім чынам, што на пярэдні план выступае самае смешнае. Мотка заяўляе не раз аб сабе, што ён не любіць сумных гісторый, яго дзіцячы аптымізм адштурхоўвае ад сябе ўсё сумнае. Таму Мотка заўважае, у першую чаргу, смешныя жэсты жанчын пры плачы, што «можна лопнуць са смеху»; таму прадажа рэшткаў мэблі з дома паміраючага кантара звязана са смешнымі манерамі, жэстамі, гутаркамі; таму Мотку дазволена перапыняць сумныя размовы пытаннямі накшталт: «Я не разумею, як гэта можна выплюнуць душу?» Наіўнасць усіх гэтых пытанняў змякчае сумны змест слова ці фразы і выклікае камічны эфект. Гэты гумар быў прызван аблегчыць пакуты хворых, галодных людзей, зняважаных і абражаных — у доўгіх чаргах ля розных эміграцкіх камітэтаў, у цесных брудных вагонах, дзе немагчыма было нават стаяць. Пісьменнік шукае ўцехі ў падкупляючай чыстаце дзіцячага вобраза, увасабляючай чыстату народнай душы, зняважанай і задыхаючайся. І таму Мотка ніколі не смешны, а наскрозь лірычны. Ён блізкі да вобраза «Тэв'е-малочнік». Калі Тэв'е-малочнік з'яўляецца ідэалам «некранутага» яўрэя, дык Мотка з'яўляецца ідэалам наіўнага, некранутага дзіцяці.

Мотка — увасабленне мары пісьменніка, ідэал народнай цэльнасці, наіўнай некранутасці. Мотка—носьбіт уцехі, аптымізму. У ім увасоблен вечны дзіцячы пачатак—цяга да жыцця, да росту, да актыўнасці. У занадта вялікай спеласці Моткі, у яго кіпучай таленавітасці, праследуемай акружаючымі, ва ўсім яго сумным маленстве заключаецца выключная аб'ектыўная праўдзівасць. Яго дзіцячая лірыка рэальна і неракаральна. Вобраз Моткі прасякнут і радасцю і смуткам. Своеасаблівасць яго аптымізму характарызуецца яго-ж словамі: «Мне пашанцавала—я сірата».

Шолам-Алэйхем пакутваў разам з усёй абяздоленай народнай масай і, жадаючы ўцешыць яе, ён хаваў свае слёзы пад сваім традыцыйным дэвізам: «Смяяцца карысна, дактары рэкамендуюць смяяцца».

Аповесць «Хлопчык Мотка» з'яўляецца яркім выражэннем гэтага смеху скрозь слёзы.

АНТОН СЯМЁНАВІЧ МАКАРЭНКА



Памёр Антон Сямёнавіч Макарэнка.

Не стала выдатнага пісьменніка, аўтара «Педагагічнай паэмы» — аднаго з лепшых твораў нашай сучаснасці. «Педагагічная паэма» перакладзена на дзесяткі моў народаў Совецкага Саюза, на многія мовы іншых народаў. У гэтым творы А. С. Макарэнка на ўвесь свой голас сцвярджае любоў да чалавека, сілу соцыялістычнага гуманізма, які перавыхоўвае і перарабляе свядомасць людзей.

А. С. Макарэнка ўзбагаціў совецкую літаратуру творамі вялікага майстэрства і вялікай выхаваўчай значымасці для маладога пакалення. Нездарма сотні тысяч выхаванцаў Антона Сямёнавіча называюць яго сваім бацькам і другам.

Мала хто з пісьменнікаў быў так звязан са сваімі чытачамі, як Антон Сямёнавіч. З усіх канцоў Совецкага Саюза чытачы пісалі яму пісьмы, прыходзілі асабіста за парадай. І Антон Сямёнавіч уважліва выслухоўваў усіх, хто чакаў яго дапамогі і парады.

Пасля твораў «Педагагічная паэма» і «Сцягі на вежах» А. С. Макарэнка выпусціў у свет першую «Кнігу для бацькоў» і распрацаваў падрабязны план новых трох кніг пад гэткаю-ж назвай. У Кнізе для бацькоў А. С. Макарэнка нанёс руйнуючы ўдар па старых метадах выхавання дзяцей, майстэрска расказаў маладым бацькам, як трэба выхоўваць маладое пакаленне краіны соцыялізма ў комуністычным духу.

Смерць абарвала прыгожае жыццё, поўнае творчага гарэння і творчых замыслаў. Засталіся ненапісанымі тры «Кнігі для бацькоў» і раман «Чалавек», засталіся нядзейсненымі дзесяткі рознастайных тэм.

А. С. Макарэнка памёр на баявым пасту совецкага пісьменніка ў поўным росквіце сваіх творчых сіл. Няўмольная смерць знайшла яго ў цягніку, калі Антон Сямёнавіч ехаў у кіностудыю на прагляд кінофільма, які ставіцца па яго сцэнарыю.

А. С. Макарэнка будзе жыць у сэрцах совецкіх людзей, як лепшы сын народа, нястомны і крыштальна чысты барацьбіт за прыгожае жыццё чалавека, за комуністычнае выхаванне сыноў і дочак соцыялістычнай радзімы.

ПАМЯЦІ А. С. МАКАРЭНКА

Совецкая літаратура страціла буйнага майстра, аўтара таленавітых, горача любімых мільёнамі совецкіх чытачоў кніг. Памёр Антон Сямёнавіч Макарэнка.

А. С. Макарэнка быў найбольш яркім прадстаўніком пісьменніка соцыялістычнай эпохі. Усё сваё жыццё, увесь свой выдатны талент ён аддаў служэнню народу. А. С. Макарэнка ўвайшоў у літаратуру з кнігай, якая адразу заваявала сэрцы чытачоў, стала настольнай кнігай мільёнаў працоўных нашай вялікай радзімы, набыла шырокую папулярнасць у чытачоў усіх буйнейшых краін свету. Гэта — раман «Педагагічная паэма», усхваляванае і натхнёнае апавяданне аб комуністычным выхаванні маладога пакалення, аб сталінскай увазе і любві к чалавеку, аб соцыялістычным гуманізме.

Да апошніх дзён свайго жыцця А. С. Макарэнка плённа працаваў на карысць любімай справы — выхавання маладога пакалення краіны соцыялізма. Ён напісаў выдатную «Кнігу для бацькоў». Смерць спыніла яго замыслы, перапыніла працу над другой часткай гэтай кнігі.

Урад Совецкага Саюза высока ацаніў заслугі А. С. Макарэнка, чалавека вялікіх мыслей і дзярзанняў, педагога-літаратара, узнагародзіўшы яго ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Светлая памяць аб выдатным пісьменніку сталінскай эпохі назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах, у сэрцах мільёнаў чытачоў нашай радзімы, якіх натхнялі і будуць натхняць творы вялікага майстра соцыялістычнай літаратуры.

ПРАЎЛЕННЕ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

МУЗЫЧНАЯ ШКОЛА-ДЗЕСЯЦІГОДКА Ў МЕНСКУ

У музычных школах БССР пачаўся адбор кандыдатаў для накіравання ў арганізуемую з новага навучальнага года ў Менску музычную школу-дзесяцігодку. Адбіраюцца асабліва музыкальна адароныя дзеці, асноўнае ядро якіх будзе складаць група юных дараванняў, якая існуе зараз пры менскай музшколе-сямігодцы.

У 10-годцы дзеці паралельна з музычнай асветай атрымаюць і агульную сярэднюю адукацыю. Вучні дзесяцігодкі будуць забяспечаны стыпендыяй, іншагароднія— інтэрнатам. Кіруючы склад школы будзе ўкамплектаван з найбольш кваліфікаваных педагогаў.

Мяркуецца, што з новага навучальнага года пачне працаваць адразу 6—7 класаў дзесяцігодкі і, такім чынам, праз 3—4 годы Кансерваторыя БССР атрымае першую групу падрыхтаваных у дзесяцігодцы студэнтаў з сярэдняй музычнай асветай.

—⊙—

КАМІСІІ ССПБ У АБЛАСЦЯХ

Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР стварыла сталыя камісіі ў Магілеўскай, Віцебскай, Гомельскай і Палескай абласцях. У функцыі камісій ўваходзіць творчая дапамога маладым пісьменнікам, наладжванне персанальнай сувязі паміж імі і пісьменнікамі Менска, арганізацыя агляду літаратурных старонак абласных газет у рэспубліканскім друку, перыядычныя выезды членаў камісій у вобласці для індывідуальнай кансультацыі, арганізацыя літаратурных вечароў у абласных цэнтрах, падрыхтоўка дакладаў аб творчасці маладых пісьменнікаў на праўленні ССПБ, арганізацыя творчых вечароў маладых пісьменнікаў у Менскім клубе пісьменнікаў і г. д.

У кожную камісію ўваходзіць 6—7 членаў Саюза совецкіх пісьменнікаў. Старшынямі камісіі з'яўляюцца: па Магілеўскай вобласці — тав. Клімковіч, па Віцебскай — тав. Камянецкі, па Гомельскай — тав. Броўка і па Палескай — тав. Модэль.

—⊙—

ГОРКАЎСКІ ВЕЧАР У ШКОЛЕ

У гомельскай сярэдняй школе № 5 імя К. Лібкнехта адбыўся вялікі літаратурны вечар, прысвечаны 71-й гадавіне з дня нараджэння вялікага пролетарскага пісьменніка А. М. Горкага.

Вучаніца-выдатніца 10 класа Ларыса Шутровіч зрабіла даклад. Школьны драмгурток паставіў п'есу «На дне», якая прайшла з вялікім поспехам.

М. ГУЦІН.

НОВЫ НАБОР У ТЭАТРАЛЬНАЕ ВУЧЫЛІШЧА

Рэспубліканскае тэатральнае вучылішча пачало падрыхтоўку да набору студэнтаў на драматычнае аддзяленне і вучняў на балетнае аддзяленне на 1939—40 навучальны год. На драматычнае аддзяленне будзе прынята на першы курс 70 чал. ва ўзросце ад 17 да 30 год. На балетнае аддзяленне будзе прынята 50 хлопчыкаў і дзяўчат ва ўзросце 9 год, скончыўшых першы клас агульнаадукацыйнай школы. Тэрмін навучання на гэтым аддзяленні — 10 год.

Такім чынам балетнае аддзяленне тэатральнага вучылішча будзе мець у наступным навучальным годзе дзве групы першага класа (50 чал.) з 10-гадовым курсам навучання, адну эксперыментальную групу другога класа (20 чал.) з 6-гадовым курсам навучання, адну групу чацвертага класа (10 чал.) з 7-гадовым курсам навучання і адну групу 6 класа (12 чал.) з 7-гадовым курсам навучання.

—⊙—

ЛЕПШЫ ДРАМКАЛЕКТЫЎ БАБРУЙСКА

Дзесяць год існуе драматычны гурток пры клубе прамкааперацыі імя Комінтэрна ў Бабруйску. За гэты час гурток дабіўся вялікіх дасягненняў у сваёй працы. Зараз у ім 21 чалавек. Заняткі праводзяцца праз дзень.

Гурток паказаў свайму гледачу «Без віны вінаватых» Астроўскага, рад п'ес совецкіх драматургаў: «Мая маці», «Вочная стаўка» і інш.

Адным з актыўнейшых і старэйшых членаў гуртка з'яўляецца тав. Кацнельсон, стаханавец шавецкай арцелі «Працрэс». Дзесяць год ён з'яўляецца членам гэтага гуртка. Актыўны ўдзел у рабоце гуртка прымае стаханавец арцелі «Чырвоны мебельшчык» тав. Хейман. Членамі гуртка з'яўляюцца і многія хатнія гаспадыні.

Драмгурток мае вялікі аўтарытэт сярод насельніцтва горада. **Н. СТЭЛЬМАК.**

—⊙—

ВЫВУЧЭННЕ НАРОДНАГА ТАНЦА

Дом народнай творчасці БССР праводзіць рад мерапрыемстваў па вывучэнню беларускага народнага танца. 8 красавіка з калгаса «III Інтэрнацыянал» Лапіцкага сельсовета Асіпавіцкага раёна вярнулася брыгада ў складзе метадыста Дома народнай творчасці па хорэаграфіі Лінёвіча і метадыста па хору Нікалаевіча. Брыгада запісала ў выкананні калгаснага танцавальнага гуртка тры старажытных народных танцы: «Мікіта», «Талока» і «Шостак».

9 красавіка ў Хойнікі для вывучэння і адбору беларускіх народных танцаў выехала брыгада ў складзе балетмейстра тэатра оперы і балета Лапухова, салісткі балета засл. арт. рэсп. Васільевай, салісткі балета Залівака і метадыстаў Дома народнай творчасці Лінёвіча і Нікалаевіча.

ВЫСТАЎКА СОВЕЦКАЙ ГРАФІКІ

6 красавіка ў памяшканні Дома мастака (Менск) адкрылася выстаўка совецкай графікі, арганізаваная Маскоўскім Дзяржаўным музеем выяўленчага мастацтва імя А. С. Пушкіна. На выстаўцы прадстаўлена 180 лепшых узораў совецкай гравюры і ілюстрацыі. Прадстаўлены такія майстры, як заслужаны дзеяч мастацтваў І. Н. Паўлаў, майстры гравюры Фаворскі, Краўчанка, Верэйскі, Ілья Сокалаў, Старанёсаў і інш. Асаблівай ўвагі заслугоўваюць партрэты таварышоў Сталіна і Варашылава работы Ілы Сокалава і партрэт В. І. Леніна работы Верэйскага. У гэтых гравюрах мастакі добра перадалі вобразы любімых правадыроў.

Вельмі цікавыя лісты з сюіты мастака Старанёсава — «Жыццё Леніна». З выключнай тонкасцю тэхнікі зроблены ілюстрацыі Фаворскага да кнігі Прышвіна, мастака Пікава — да рускіх народных казак, Грозеўскага — да «Снягурачкі».

Багатае, рознастайнае жыццё Совецкага Саюза знайшло адлюстраванне ў выдатных работах Ігліна («Бухта Ільіча», «Пагрузка бензіну на танкер»), Бібікава («Нафта плыве з Баку ў Ленінград»), Шэвердзяева («Будаўніцтва Палаца Советаў») і інш.

Рад работ прысвечан жыццю і вучобе Чырвонай Арміі (Кірпічоў, Добраў і інш.).

Вялікай увагі заслугоўвае дзіцячая зала. Сталінская любоў і клопаты аб дзецях знайшлі адлюстраванне ў высокамастацкіх гравюрах Чарушына, Кузняцова, Канашэвіча і інш.

Выстаўка паказвае вялікі рост майстроў совецкай гравюры, якія здолелі на такім матэрыяле, як дрэва, лінолеум, літаграфскі камень, медныя і цынкавыя дошкі, у жывой мастацкай форме адлюстраваць грандыёзнае будаўніцтва ў нашай краіне.

У сувязі з недахопам памяшкання выстаўлена пакуль совецкая графіка. У 20 лічбах красавіка будзе выстаўлена стараруская гравюра і спецыяльны аддзел «Ваеннае мінулае рускага народа ў гравюры».

Экскурсійную работу на выстаўцы праводзяць навуковыя работнікі — экскурсаводы музея імя Пушкіна. **П.**

„ЧУЖЫ ГРУНТ“ І. ГРАМОВІЧА

Малады пісьменнік Іван Грамовіч надрукаваў у «Полымі рэволюцыі» № 1 за 1939 год цікавую і змястоўную аповесць «Чужы грунт». У аповесці паказан падхалім і шкурнік Вілюевіч, якога прывялі ў стан ворагаў пагоня за таннай славай, імкненне ўзвысіцца над акружаючымі і камандаваць імі, празмерны клопат аб уласным добрабыце.

Аўтар старанна, крок за крокам, вядзе чытача следам за Вілюевічам, паказваючы нам яго ў самых рознастайных абставінах жыцця. Мы сустракаемся з Вілюевічам у будаўнічай брыгадзе калгаса, прысутнічаем пры яго размове аб дзяўчатах з маладым стаханаўцам Нерушам, з прыкрасцю наглядаем, як Вілюевіч імкнецца ўпэўніць студэнтку-комсамолку Алесю ў сваім каханні. Ва ўсіх гэтых выпадках мы адчуваем, бачым, часам здагадваемся, што паводзінамі Вілюевіча кіруе толькі імкненне выдзеліцца, бліснуць, узняцца яшчэ на ступеньку вышэй у сваёй кар'еры.

Бясспрэчна, што такія людзі, як Вілюевіч, з'яўляюцца тым матэрыялам, тым асяроддзем, з якога ворагі народа вярбуюць выканаўцаў сваіх брудных спраў, агентаў фашысцкіх разведак. У гэтым Грамовіч праў, але няпраў малады пісьменнік у самым галоўным і істотным. Пры першым-жа знаёмстве з Вілюевічам чытач даведваецца, што гэты чалавек беспрыменна здрадзіць радзіме. Больш таго, калі мы ведаем яшчэ аб Вілюевічу вельмі мала, дык аўтар некалькі разоў намякае нам, што перад намі чалавек з таямнічымі планамі і мэтамі.

«—Падумай над пільнасцю. Знаходзь ворагаў, лушчы... тады, калі ты хочаш, табе многа давераць,» — павучае Вілюевіча яго сябра Журок.

«— Браток... браток... не падмажаш— не паедзеш,» — адказвае на гэта Вілюевіч.

Гэта мы чытаем у самым пачатку аповесці. А праз некалькі старонак аўтар зводзіць свайго героя са старшынёй калгаса Варонічам, і калі яны выпіваюць па чарцы гарэлкі, Грамовіч так гаворыць аб гэтым выпадку:

«Старшыня ўзяў на сябе доўг, пра які падумаў ужо многа часу пазней, калі вярнуцца назад было нельга, а наперадзе ўсе дарогі сышліся ў клін».

Такім чынам, з першых радкоў аповесці ў чытача ствараецца ўражанне, што Вілюевіч прыехаў у калгас закончаным ворагам, прыехаў з варожымі мэтамі. А ў канцы аповесці мы прысутнічаем пры тым, як прыехаўшы ў калгас ветэрынар карыстаецца слабасцю Вілюевіча і прымушае яго заняцца шкодніцкай дзейнасцю. Толькі тут мы даведваемся, што да гэтага часу перад намі быў звычайны падхалім, калі хочаце, жулік, але ва ўсякім выпадку яшчэ не дыверсант. Нам здаецца, што малады пісьменнік аказаўся ў палоне шаблона і не здолеў абгрунтаваць закономернасць і непазбежнасць здрады Вілюевіча. Аўтар кіруецца такім шаблонным тэзісам: усякі падхалім раней ці пазней павінен упасці і аказацца ў лапах замежных разведак.

Мы лічым, што Вілюевіч не абавязкова павінен быў упасці. Жыццёвы вопыт паказаў, што совецкая грамадскасць у сілах перавыхаваць нават і такіх людзей, зрабіць іх свядомымі і актыўнымі грамадзянамі нашай радзімы. Ва ўсякім выпадку, скатванне Вілюевіча ў лагер ворагаў павінна было адбыцца не так лёгка і проста, амаль выпадкова, як паказаў гэта Грамовіч.

Успомнім, як быў завербаван ворагамі Вілюевіч. Ён скалечыў калгаснага жарабка і, каб утаіць сваё злачынства, выпрасіў у ветэрынарнага фельчара заключэнне, што жарабок загінуў не па віне Вілюевіча. У адплату за паслугу фельчар прымусіў незадачлівага падхаліма выконваць заданні замежнай разведкі. Усё гэта выйшла надзвычай проста, але затое... не пераканаўча. Калі Грамовіч хацеў абавязкова зрабіць свайго героя ворагам, то ён павінен быў хоць у якой-небудзь меры паказаць, якім чынам ворагі ігралі на слабых струнках яго характару, раскладалі яго і крок за крокам уцягвалі ў сваё злачыннае асяроддзе. Толькі ў гэтым выпадку была-б мастацка абгрунтавана яго здрада, было-б зразумела, як вораг у патэнцыі стаў ворагам канчатковым і актыўным.

Вілюевічу ў аповесці процістаяць старшыня калгаса Іван Іванавіч Вароніч, яго дачка Алеся, малады стаханавец Андрэй Неруш, дзед Ермалай. Але ўсе гэтыя вобразы аўтарам ледзь-ледзь намечаны. Аб старшыні калгаса мы толькі ведаем, што гэты руплівы і чэсны чалавек быў у мінулым «бравым партызанам», а ў калгасе ён дабіваецца, каб «ва ўсім быў парадак». Алеся ў Грамовіча жыве толькі каханнем да Андрэя і пасіўна ставіцца да ўсяго астатняга. Андрэй Неруш не верыць Вілюевічу, лічыць яго нячэсным і няшчырым чалавекам, але трымае гэту думку пры сабе і таксама не дае актыўнага адпору прахадзімцу. Дзед Ермалай лічыць Вілюевіча «плюгавым прахвостам», толькі на той падставе, што «яго бацька... ад спірту згарэў».

Слабасць, невыразнасць дадатных вобразаў, іх хадульнасць у значнай меры перашкодзілі Грамовічу правільна ўскрыць прычыну падзення Вілюевіча. Магчыма, што калі-б гэтаму прайдзісвету процістаяла больш актыўна калгасная грамадскасць, калі-б дадатныя героі аповесці былі крыху лепш паказаны, падзеі маглі-б разгарнуцца інакш.

Трэба сказаць асобна аб надзвычай рыхлай кампазіцыйнай пабудове аповесці. Зусім непатрэбен трэці раздзел аповесці, дзе апавядаецца аб сустрэчы Вілюевіча з Журком. Не варта было столькі разоў вадзіць чытача з Падгайскага тэхнікума ў калгас і з калгаса ў тэхнікум, тым больш, што ні тут, ні там Алеся сябе нічым асаблівым не праяўляе. Надумана і штучна атрымалася сутычка паміж Андрэем і фельчарам. Калі-б Андрэй, ідучы з канюшні, не спаткаўся лоб у лоб з фельчарам і не пайшоў за ім, таму ўдалося-б выбрацца з калгаса без усякай небяспекі для сябе. Не насцярожнасць і пільнасць калгаснікаў, а выпадковая сутычка з Андрэем вырашыла лёс чалавека, які нанёс калгасу велізарную шкоду. Аўтар і тут спрасціў сітуацыю і пайшоў па самай лёгкай лініі: вораг так ці інакш павінен быць выкрыт. Не важна, маўляў, як гэта будзе паказана ў творы.

Трэба сказаць некалькі слоў аб мове аповесці. Тут ужо трэба шчыра сказаць Грамовічу, што над мовай свайго твора ён працаваў мала. Мы сустракаемся з такімі сказамі, якія выклікаюць здзіўленне сваёй недапрацаванасцю: «сабачы брэх **спалохаў Алесіны мары»**, «Вілюевіч... **самаадданы** загаварыў», «каштоўнае **адзенне,** належачае яму **як уласнасць»,** «пары тае даўно адшумелі дні», «як заўсёды з дзяўчатамі завіхрыўся вясёлы карагод».

Такія пагрэшнасці і шарахаватасці мовы сустракаюцца амаль на кожнай старонцы і яны значна абясцэньваюць аповесць.

Не гледзячы, аднак, на свае вялікія недахопы, аповесць «Чужы грунт» з'яўляецца значным дасягненнем маладога пісьменніка. Грамовіч узяў тэму, якая амаль нікім яшчэ ў беларускай літаратуры не распрацавана, ён здолеў выклікаць у чытача пачуццё агіды і нянавісці да падхалімаў і шкурнікаў, якія дзе-ні-дзе яшчэ захаваліся брудным паростам на здаровым целе совецкага грамадства. Над аповесцю варта яшчэ папрацаваць. Трэба выправіць асобныя недахопы яе, зрабіць больш стройнай яе кампазіцыю. Мы думаем, што тав. Грамовіч гэта зробіць.

Я. ГЕРЦОВІЧ.

А. ФЕЎРАЛЬСКІ

МАЯКОЎСКІ—ДРАМАТУРГ

Владзімір Маякоўскі, па вызначэнню таварыша Сталіна — «лепшы, таленавіцейшы паэт нашай совецкай эпохі»— быў буйнейшай фігурай не толькі ў совецкай літаратуры, але і ў совецкім тэатры. Драматургічная спадчына Маякоўскага колькасна невялікая, але яна вельмі значымая.

Першую сваю п'есу Маякоўскі напісаў дваццаці год ад нараджэння—у 1913 годзе. Гэта была трагедыя ў вершах «Владзімір Маякоўскі». Як відаць з загалоўка, галоўнай дзеючай асобай п'есы быў сам аўтар. У п'есе выражана трагедыя вялікага чалавека, які задыхаўся ў абстаноўцы перадрэволюцыйнай Расіі. Тэмы, характэрныя для паэзіі Маякоўскага ў перадрэволюцыйны перыяд,—тэмы «горада» і «рэчы»,—праходзяць праз усю п'есу таксама, як і элементы расплывучатага, соцыяльна яшчэ не асэнсаванага бунтарства. Паэт у фантастычных персанажах увасабляе стан і пачуцці рэальных людзей. Трагедыя напісана ў манеры своеасаблівага эксцэнтрычнага псіхалагізма і рэзка вылучаецца з усёй сучаснай ёй драматургіі.

Наступная вялікая п'еса Маякоўскага, напісаная ў 1918 годзе, носіць зусім іншы характар. Гэта «Містэрыя-Буфф», якая з'явілася родапачынальніцай совецкай драматургіі. Гэта першая совецкая п'еса — напісаная ў РСФСР совецкім аўтарам і пастаўленая ў совецкім тэатры. Яшчэ важней, што гэта першая п'еса, якая ўслаўляла Кастрычніцкую рэволюцыю. Яна — адзіная п'еса з усяго рэпертуару, створанага ў першыя годы Совецкай улады. «Гэта,—пісаў А. В. Луначарскі,—вясёлае сімвалічнае падарожжа рабочага класа, які пасля рэволюцыйнага патопу паступова вызваляецца ад сваіх паразітаў, праз пекла і рай у зямлю абетаваную, якая аказваецца нашай-жа грэшнай зямлёй, толькі амытай рэволюцыйным патопам, і на якой усе «таварышы рэчы» з нецярплівасцю чакаюць свайго брата— працоўнага чалавека». Навізна тэмы, адказваючай на самыя неабходныя патрабаванні новага гледача, які прышоў у тэатр, адпавядала і навізна прыёму літаратурнай і тэатральнай выразіцельнасці. «Містэрыя-Буфф», пачынаючы лінію совецкага палітычнага тэатра, мела вялікі ўплыў на далейшае развіццё совецкай драматургіі і тэатра ў цэлым. Яна была пастаўлена ў 1918 годзе, у першую гадавіну Кастрычніцкай рэволюцыі, у Петраградзе.

У 1920—21 годзе Маякоўскі перапрацаваў «Містэрыю-Буфф», уключыўшы ў яе рад злобадзённых момантаў і надаўшы ёй характар палітычнага агляду. У гэтай другой рэдакцыі «Містэрыя-Буфф» была пастаўлена ў Маскве.

У той-жа перыяд Маякоўскі напісаў рад невялікіх агітацыйных п'ес. У 1920 годзе, напрыклад, тры першамайскія п'ескі з такімі вершаванымі назвамі:

1) «А что если?

Первомайские грезы в буржуазном кресле».

2) «Пьеска про попов, кои не понимают, праздник что такое».

3) «Как кто проводит время праздники празднуя. (На этот счет замечания разные)».

У гэтым-жа годзе ён напісаў цыркавое антрэ «Чэмпіянат сусветнай класавай барацьбы», у наступным—«тэатральную справаздачу» пад загалоўкам «Вчерашний подвиг (что сделано нами с отобранными у крестьян семенами)». Пазней, у 1926 годзе, ён напісаў сумесна з О. М. Брыкам гратэск «Радыё-Кастрычнік».

Таксама ў 1926 годзе Маякоўскі пачаў працаваць над п'есай «Камедыя з забойствам» (на тэму аб сутычцы культур совецкай і капіталістычнай); нажаль, п'еса гэта засталася незакончанай.

Да дзесятай гадавіны Кастрычніка Ленінградскі Малы оперны тэатр заказаў Маякоўскаму юбілейнае прадстаўленне. З гэтага заказу вырасла паэма «Харашо». У тэатры частка паэмы была інсцэніравана ў выглядзе масавай тэатральна-музычнай дзеі пад назвай «Дваццаць пятае».

Свой кіносцэнарый «Забудзь пра камін» Маякоўскі перапрацаваў у «феерычную камедыю» «Клоп», пастаўленую ў 1929 годзе. Дзея першай часткі п'есы адбываецца ў сучасны момант, другой часткі— у будучыні, праз 50 год. Тэма камедыі— выкрыццё сёнешняга мяшчанства. П'еса бязлітасна бічуе п'янства, падхалімства, хамства, гразь, а разам з імі і атручваючы ўплыў мяшчанскай «культуры»—сумную спадчыну мінулага. Драматургічная пабудова камедыі арыгінальная, дзея разгортваецца імкліва, тэкст вызначаецца бліскучай дасціпнасцю.

Праз год была пастаўлена яшчэ адна п'еса Маякоўскага —«Баня», якая мае падзагаловак «драма з цыркам і феерверкам». Тут Маякоўскі паказаў бюракратызм у сутычцы з творчым парывам рабочых. Рабочае вынаходніцтва дадзена як адзін з участкаў барацьбы за час, за тэмпы, за шырокія гарызонты соцыялістычнага будаўніцтва. Дзякуючы вынайдзенай рабочым «машыне часу» паяўляецца «фосфарычная жанчына» — дэлегат 2030 года і тая-ж машына заносіць людзей нашых дзён у комуністычную будучыню. Напісаная (таксама, як і «Клоп») прозай, «Баня», дзякуючы выключна-дасканалай мове, гучыць у многіх месцах як вершаваны твор.

Апошнім відовішчным творам Маякоўскага была пантаміма-феерыя ці «меломіма» «Масква гарыць» («1905 год»), у якой дадзены моманты падзей 1905 года, а пасля далейшыя этапы барацьбы рускага рабочага класа за сваё вызваленне і за пабудову соцыялізма ў нашай краіне. Прэм'ера «Масква гарыць» у маскоўскім цырку адбылася праз тыдзень пасля смерці Маякоўскага. Рэжысёрска-пастановачныя ўказанні, якія Маякоўскі даў к тэксту «Масква гарыць», сведчаць аб тым, што паэт валодаў бліскучымі рэжысёрскімі здольнасцямі.

Маякоўскі, працуючы ў тэатры, не абмяжоўваўся функцыямі драматурга. Ён прымаў удзел у якасці актора ў пастаноўках «Владзіміра Маякоўскага», першай рэдакцыі «Містэрыі-Буфф» і самым дзейсным чынам супрацоўнічаў з В. Э. Мейерхольдам (які паставіў усе яго буйнейшыя п'есы) у якасці сурэжысёра ці асістэнта ў рабоце над абедзвюма рэдакцыямі «Містэрыі-Буфф», над «Клапом» і над «Баняй».

Апрача непасрэднай творчай дзейнасці, Маякоўскі заўсёды выступаў на тэатральным фронце як грамадскі дзеяч. Мала таго, што ён любіў чытаць свае п'есы на рабочых сходах, чула прыслухоўваючыся да водгукаў слухачоў (нярэдка ён карыстаўся іх заўвагамі для ўнясення ў п'есу дадаткаў і паправак), — ён актыўна прапагандыраваў свае погляды на тэатр у публічных выказваннях, артыкулах, вершах і нават саміх п'есах (асабліва ў «Бані»).

П'есы і агіткі Маякоўскага маюць рад спецыфічных рысаў, дазваляючых гаварыць аб «тэатры Маякоўскага», як аб своеасаблівай драматургічнай сістэме. Тэатр Маякоўскага — тэатр агітацыйна-прапагандысцкі, адкрыта тэндэнцыйны, у якім публіцыстычнасць неадлучна ад высокага майстэрства і арыгінальных прыёмаў. Работа Маякоўскага ў РОСТА і ў газетах нямала садзейнічала злободзённасці яго драматургіі. Тэатр Маякоўскага — тэатр актыўнага дзеяння. Ставячы пытанні проста, «у лоб», Маякоўскі дасягаў часам у сваіх п'есах вялікай грамадска-палітычнай вайстрыні. Тэмперамент барацьбіта-рэволюцыянера Маякоўскага пакідаў яркі адбітак на яго п'есах, і гэта ў значнай меры павышала іх эмацыянальную сілу.

Зацвердзіўшы на совецкай сцэне палітычны тэатр, Маякоўскі застаўся верным яму да канца: кожная яго новая сцэнічная рэч з'яўлялася новай маніфестацыяй палітычнага тэатра. Паэт-публіцыст, ён заставаўся публіцыстам і ў драматургіі. Кожная яго рэч была зброяй барацьбы за перамогу дыктатуры пролетарыята, за перамогу соцыялізма.

Наватарства Маякоўскага ў тэатры цесна звязана з яго наватарствам у літаратуры. Ствараючы новую паэзію, Маякоўскі ўносіў у яе ўсю паўнату жыццёвых адчуванняў, уражанняў і праў чалавека эпохі сусветнай вайны і барацьбіта за соцыялістычную рэволюцыю.

Кладучы ў аснову сваіх п'ес сапраўдныя адносіны людзей, падкрэсліваючы ў з'явах іх вядучыя тэндэнцыі, асвятляючы іх з пазіцый барацьбы за соцыялізм, Маякоўскі будаваў тэатр рэалістычны.

Як і ва ўсёй творчасці Маякоўскага,— у яго п'есах сатыра займае вельмі важнае месца. Сваіх адмоўных «герояў» Маякоўскі карае смехам. Маякоўскі — не гумарыст, а іменна сатырык, — такім робяць яго грамадская накіраванасць, соцыяльная вайстрыня яго смеху.

Тэатру Маякоўскага ўласцівы элемент фантастыкі. Але фантастыка Маякоўскага рэалістычная: за неверасмнымі падзеямі хаваецца сапраўдная рэчаіснасць. Ён глядзеў уперад, ён хацеў бачыць тое, да чаго мы ідзём, за што змагаемся, хацеў апавяданнем аб будучым натхніць удзельнікаў гэтай барацьбы, удыхнуць у іх новыя сілы.

Віртуознасць мовы Маякоўскага, бляск, навізна і вайстрыня слоўных вобразаў, рытму, рыфмы ў яго тэатры застаюцца тымі-ж, што і ў яго паэзіі. Маякоўскі пакінуў бліскучыя ўзоры мэтанакіраванай працы над мовай, узоры высокай якасці і яркай дзейснасці слова. Гэтыя ўзоры павінны старанна вывучацца нашымі драматургамі.

І наогул, тэатральная спадчына Маякоўскага заслугоўвае самай пільнай увагі. У ёй крыюцца такія сілы, якія могуць і павінны даць надзвычай многа каштоўнага як чытачам і гледачам яго п'ес, так і драматургам, рэжысёрам і акторам, будуючым совецкі тэатр.



14 красавіка спаўняецца 9 год з дня смерці В. В. Маякоўскага. На здымку: В. В. Маякоўскі ў 1930 годзе. Фотахроніка ТАСС.

„ІНДУСТРЫЯ СОЦЫЯЛІЗМА“

Выстаўка «Індустрыя соцыялізма» п[illegible] ярка указвае на тое, што совецкія мастакі свята ахоўваюць лепшыя традыцыі рускага рэалізма, — рэалізма Сурыкава, Рэпіна, Верэшчагіна, рухаюць гэты рэалізм наперад, узбагачаюць яго новымі жывапіснымі сродкамі і зместам соцыялістычнай эпохі.

Ва ўступным аддзеле выстаўкі, прысвечаным дарэволюцыйнай рускай прамысловасці, вы сустракаецеся з тэмамі, якія ў свой час падымаліся і старымі рускімі мастакамі, але зараз вырашаны па-новаму. У гэтым аддзеле звяртае асаблівую ўвагу карціна Б. В. Іогансона «Урал Дэмідаўскі». Якія выдатныя і праўдзівыя ў сваім абагульненні вобразы створаны мастаком! Вы глядзіцё на абрузглага гаспадара-заводчыка, апранутага ў дарагую футравую шубу, абапёршагася правай рукой на кіёк і з абурэннем і здзіўленнем пазіраючага на рабочага-рэволюцыянера Рабочы сядзіць перад апокай і, энергічна павярнуўшы галаву ў бок гаспадара, са зпішчаючай агідай глядзіць на яго. Асвятленне сканцэнтравана на гэтых двух фігурах. Вы глядзіцё на іх і адчуваеце ў паядынку позіркаў гаспадара і рабочага гістарычны паядынак двух класаў.

Гэта карціна пераконвае сваёй праўдай, яна вучыць ненавідзець капіталізм і любіць нашу соцыялістычную радзіму.

Вялікае майстэрства, тыпізацыю і абагульненне паказваемай натуры бачым мы таксама і ў жывапіснай сюіце выдатных мастакоў Букрыніксаў. Сюіта складаецца з трох карцін, якія расказваюць «аб старых гаспадарах». У лепшай з гэтых карцін — «Малебен на закладцы фабрыкі»—Кукрыніксы з выдатным майстэрствам раскрываюць гісторыю скараспелага рускага капіталізма, рэлігійнае мракабессе і дзікасць царскай Расіі. Мы бачым на гэтай карціне кандовага патрыярха буржуазнай сям'і, у мінулым, відаць, кулака, які хрысціцца ў рэлігійным экстазе. Злева ад яго—сын, напышчаны буржуа, з не менш урачыстай і пышнай жонкай і крэпінападобным сынам-гімназістам. У гэтых вобразах мастакі як-бы ўвасобілі пачатак, росквіт і прадбачанне трагічнага канца рускага капіталізма.

Карціны Ф. І. Багародскага «Гарнякі адыходзяць на фронт», Е. В. Ільіна «Трыпольская трагедыя», Р. Р. Франца «Абарона Царыцына» аднаўляюць перад гледачом пройдзены вялікім совецкім народам гістарычны шлях жорсткіх схватак са шматлікімі ворагамі. Недарма праліваў народ сваю кроў, — у гэтай барацьбе ён набыў сваё шчасце, так ярка аллюстраванае совецкімі мастакамі на іх шматлікіх палотнах, прысвечаных соцыялістычнай індустрыі і яе выдатным людзям.

Большэвікі змяняюць твар совецкай зямлі. І мы бачым гэта на індустрыяльных пейзажах, сярод якіх вылучаюцца «Агні Днепрагэса» В. А. Кузняцова і «Азоўсталь» К. Ф. Багаеўскага. Буйнейшыя вытворчыя цэхі, велізарныя кампазіцыі на тэмы працы разгорнуты на палотнах. Сярод іх вылучаецца па каларыту карціна В. Л. Сідарэнка «Адкрыццё Вахшскай плаціны».

Выстаўка «Індустрыя соцыялізма» пасапраўднаму паставіла перад нашымі мастакамі праблему паказу соцыялістычнай працы ў выяўленчым мастацтве, і над гэтай праблемай нашым мастакам прадстаіць шмат папрацаваць.

Новыя людзі, новыя пачуцці, новыя ўзаемаадносіны паміж людзьмі. Аб гэтым з вялікім майстэрствам расказвае ў сваёй карціне «Незабыўнае» В. П. Ефанаў. На карціне мы бачым таварышоў Сталіна, Молатава, Орджанікідзе і Варашылава сярод удзельнікаў нарады жонак ІТР. Сталін цёпла паціскае руку адной з дэлегатак. Дэлегаткі вітаюць Сталіна. Мастаку ўдалося ў яркай гамме, проста і хвалююча выразіць на карціне вялікую любоў народа да правадыра — таварыша Сталіна.



З экспанатаў выстаўкі. Карціна мастака **Д. А. Налбандзян:** «Таварышы Орджанікідзе і Берыя на Бакінскіх промыслах». Фотахроніка ТАСС.

Максім Горкі ў заметках аб усерасійскай мастацкай выстаўцы 1896 года справядліва папракаў рускіх мастакоў таго часу, што яны не займаюцца жанравым жывапісам, што яны не ведаюць быту свайго народа. Мы смела можам сказаць, што совецкія мастакі ў значнай меры ўжо вырашылі праблему совецкага жанравага жывапісу. Гэта — вялікая заваёва і яна стала магчымай толькі таму, што совецкія мастакі, у адрозненне ад большасці мастакоў старой Расіі, кроўна звязаны са сваім народам, што ім блізак і дораг быт свайго народа.

Сярод лепшых жанравых работ назавём карціны «Вяселле ў рабочай сям'і» Ф. В. Антонава, «Сустрэча сяброў» Ф. С. Шурпіна і «Окцябрыны» А. П. Бубнова. На карціне Бубнова мы бачым маладую маці з дзіцём на руках. Шчаслівую маці вітаюць сябры, раздзяляючы яе радасць. Карціна напісана настолькі пераканаўча, што вы пачынаеце адчуваць сябе ўдзельнікам гэтага свята.

Аб новай калгаснай вёсцы лепшыя карціны напісаны С. В. Герасімавым і А. А. Пластовым. Тэмай сваіх карцін гэтыя мастакі ўзялі свята ў калгасе. Карціна Герасімава вылучаецца сонечным, радасным каларытам. А. А. Пластоў імкнецца да матэрыяльнай ушчыльнёнасці форм, да тыпізацыі вобразаў, да паказу калгаснага свята ва ўсёй яго разнастайнасці. Гэта сапраўды народная карціна, якая апавядае аб урачыстасці калгаснага ладу, аб радасцях людзей калгаснай вёскі.

Таксама запамінаюцца карціны «На Далёкім Усходзе» таленавітага Г. Г. Ніскага, «У ложы Вялікага тэатра» О. Д. Яноўскай, «Начальнік палітаддзела аглядае палі» Т. Г. Гапаненка, «Два браты» Ф. І. Невежына і «Сустрэча» Г. К. Савіцкага. З работ А. А. Дэйнека асабліва вылучаецца карціна «Чырвонакрылы гігант», прысвечаны пералёту совецкіх лётчыкаў праз Паўночны полюс у Амерыку. Выдатна зроблена карціна «Бэз» П. П. Канчалоўскага.

Скульптура прадстаўлена работамі М. Г. Манізера, С. Д. Меркурава, І. Д. Шадра і іншых. З маладых скульптараў назавём ленінградцаў В. І. Інгала і В. Н. Багалюбава, якія выставілі выдатную скульптуру «Серго — трыбун». Інгал і Багалюбаў змаглі надаць скульптурнаму вобразу Серго ўнутраны рух, цеплыню і абаяльнасць характару.

Прыемна адзначыць, што ў гэтай выключнай па свайму значэнню выстаўцы ўдзельнічаюць і беларускія мастакі. Акварэльныя работы Л. М. Лейтмана і І. О. Ахрэмчыка вылучаюцца значным майстэрствам і лірызмам і сведчаць аб тым, што Совецкая Беларусь мае кадры выдатных акварэлістаў. З станкавых работ беларускіх мастакоў на выстаўцы дэманструецца толькі адна жанравая карціна Н. А. Пашкевіча «На прагулцы». Пашкевічу нельга адмовіць у разуменні колеру і ў рысунку, але яму не ўдалося вырашыць задачу пленера: маладыя рабочы і работніца з веласіпедам і кветкамі, якія стаяць на першым плане, як-бы механічна прыстаўлены да беларускага пейзажа. Не ўдалося Пашкевічу перадаць у вобразах паказваемых персанажаў і настроі прагулкі.

З беларускіх скульптараў на выстаўцы выступае заслужаны дзеяч мастацтваў А. В. Грубэ. Прадстаўлена яго «Трактарыстка», выразаная з дуба. Да вартасцей гэтай скульптуры трэба аднесці яе манументальнасць, але манументальнасць гэта, нажаль, пераходзіць граніцы дазволенага: формы празмерна абагулены, ад чаго твар трактарысткі атрымаўся невыразным. «Трактарыстка» А. В. Грубэ ўсё-ж прадстаўляе цікавую з'яву на выстаўцы.

Выстаўка «Індустрыя соцыялізма» надзвычай павучальная. Яна гаворыць аб буйных поспехах совецкага выяўленчага мастацтва. Беларускія мастакі, якія працуюць зараз над надзвычай адказнымі гістарычнымі карцінамі для выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці», павінны шмат чаму павучыцца на лепшых мастацкіх узорах выстаўкі «Індустрыя соцыялізма». Выдатныя работы Б. В. Іогансона, Кукрыніксаў, В. П. Ефанава і іншых лепшых мастакоў, прадстаўленых на выстаўцы ў Маскве, даюць нашым маладым мастакам ключ к разуменню таго, як трэба вучыцца і працаваць у духу крытычнага наследвання лепшых традыцый рэалістычнага мастацтва, як ствараць новае соцыялістычнае мастацтва.

А. ДАЛІН.

Масква (**наш. спец. кар.**).

ГАСТРОЛІ ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРА ЛЯЛЕК БССР У МЕНСКУ

24 сакавіка ў Менску пачаў гастролі Дзяржаўны тэатр лялек БССР.

Гэты малады калектыў існуе ўсяго 8 месяцаў. Большасць актораў тэатра прышлі з мастацкай самадзейнасці. За гэты час моладзь прарабіла вялікую работу. У тэатры сістэматычна вывучаецца майстэрства актора, лялькаснаўства, мастацкае чытанне. Акторы ў гуртку вывучаюць гісторыю ВКП(б).

За кароткі час тэатр паставіў спектаклі: «Па шчучаму вяленню» Цераховскай (рэжысёр М. Райская), «Вясёлы партняжка» па казках бр. Грым (рэжысёр К. Кузнецоў) і «Казка пра папа і работніка яго Балду» (пастаноўка мастацкага кіраўніка тэатра Я. Жовінскага).

Тэатр арганізаваў другую творчую брыгаду, якая прыступіла да самастойнай падрыхтоўкі новага спектакля. У другой палове 1939 года будзе арганізавана трэцяя брыгада. Такім чынам тэатр зможа адначасова абслугоўваць тры аб'екты, выязджаючы ў розныя раёны БССР. Адна з брыгад будзе працаваць з лялькамі-марыянеткамі.

У бліжэйшы час тэатр пакажа спектакль «Дзед Улай» украінскага драматурга Ю. Макрэева. П'еса малюе быт і жыццё рыбацкай арцелі, а таксама расказвае аб дапамозе совецкіх грамадзян пагранічнікам у барацьбе з парушальнікамі граніцы — дыверсантамі.

Для дзяцей малодшага ўзросту тэатр падрыхтуе спектакль «Мойдадыр» К. Чукоўскага.

Беларускі драматург В. Вольскі піша для тэатра арыгінальную п'есу па матывах беларускіх народных казак.

Дзіцячы глядач надзвычай добра ўспрымае спектаклі Тэатра лялек. Тэатр прабудзе ў Менску звыш месяца. За гэты час ён абслужыць піянераў, школьнікаў і дзяцей малодшага ўзросту, зробіць рад выездаў у менскія школы. Зараз тэатр працуе ў Палацы піянераў і ў Тэатры юнага гледача. Сталая база тэатра — Гомель, Палац піянераў. **А. Е.**

—⊙—

САМАДЗЕЙНЫЯ ГУРТКІ Ў ШКОЛЕ

Пры Бабруйскай фельчарскай школе актыўна працуе харавы гурток. У яго складзе 44 студэнты. Хор школы ў 1938 годзе заняў першае месца на агульнашкольнай і агульнагарадской алімпіядах мастацкай самадзейнасці. Зараз хор вывучае песні «Вінтоўка», «Ля возера Хасан» і інш.

Драматычны гурток школы налічвае ў сваім складзе 25 студэнтаў і зараз працуе над пастаноўкай п'есы «Вочная стаўка».

Пры школе працуюць таксама фізкультурны і балетны гурткі.

І. Н. УСАЎ.

—⊙—

ДВА НОВЫХ ЭСКІЗЫ

Мастацкі совет выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці» разгледзеў эскіз групавой скульптуры, прадстаўлены маладым скульптарам А. Жоравым, — «Серго Орджанікідзе ў разведцы пад Барысавам» і эскіз карціны мастака М. Манасзона — «Барацьба з нямецкімі акупантамі».

Пры абмене думкамі члены мастацкага совета тт. Волкаў, Азгур, Пашкевіч, Зайцаў і іншыя адзначылі сур'ёзныя адносіны маладых мастакоў да выканання пастаўленых перад імі творчых задач. Асабліва ўдалы і цікава скампанаваны эскіз А. Жорава. Войстра і цікава вырашана мастаком Манасзонам тэма нападу чырвоных партызан на абоз нямецкіх акупантаў з нарабаваным дабром.

Абодва эскізы мастацкім советам ухвалены.

20-ГОДДЗЕ МАГІЛЕЎСКАЙ МУЗЫЧНАЙ ШКОЛЫ



Выдатніцы вучобы Магілеўскай музычнай школы В. Аляксейчык і І. Гого ляраяля. Фотахроніка БЕЛТА.

У Магілеве ўрачыста адзначана 20-годдзе музычнай школы імя Рымскага-Корсакава.

Да рэволюцыі ва ўсёй Магілеўскай губерні не было ні адной музычнай навучальнай установы. У 1919 годзе, як толькі горад быў ачышчан ад нямецкіх акупантаў, была створана музычная школа для дзяцей рабочых, сялян і інтэлігенцыі.

За 20 год школа выпусціла каля 500 чалавек. Амаль усе яны ўступілі ў сярэднія і вышэйшыя музычныя навучальныя ўстановы, сталі спецыялістамі совецкага мастацтва. Былая вучаніца школы, выхаванка дзіцячага дома Тацьяна Талахадзе на ўсесаюзным конкурсе атрымала ганаровы дыплом. Яна з'яўляецца вядучай артысткай у адной з оперных студый Масквы. Сын урача Леў Гінзбург цяпер кандыдат музычных навук, працуе ў якасці педагога ў Маскоўскай Дзяржаўнай кансерваторыі. Сын рабочага швейнай фабрыкі імя Валадарскага Хаім Фрыдман— таленавіты флейтыст аркестра Тэатра оперы і балета БССР.

Школай бязменна кіруе энтузіяст сваёй справы, чулы педагог, энергічны арганізатар Лазар Маркавіч Зісман. Ён працуе з першага дня арганізацыі школы. За асобыя заслугі ў справе выхавання дзяцей ён узнагароджан граматай Вярхоўнага Совета БССР.

Таварышы Зісман, Еўстратаў, Карэнеўская, Юшкевіч, Боркус, Меркіна выхавалі і падрыхтавалі для нашай краіны сотні таленавітых музыкантаў.

Зараз у школе навучаюцца каля 400 дзяцей. У 1937 годзе ў Магілеве было адкрыта музычнае вучылішча, у якім папаўняюць сваю музычную адукацыю выпускнікі школы.

Калектыў школы актыўна ўдзельнічае ў грамадска-палітычным жыцці краіны. За 1938 год ім было арганізавана каля 40 творчых канцэртаў на прадпрыемствах, у калгасах, на выбарчых участках у дні выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

На юбілейным вечары 7 красавіка прысутнічалі прадстаўнікі гарадскіх, абласных і рэспубліканскіх арганізацый, фабрык і заводаў, вучні і педагогі школы, былыя яе выхаванцы, якія прыехалі з розных гарадоў СССР на юбілейнае свята. Школа атрымала вялікую колькасць прывітанняў: ад Соўнаркома БССР, Усесаюзнага Камітэта і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР, абкома і гаркома КП(б)Б і ЛКСМБ, Горсовета, народнай артысткі БССР Л. П. Александроўскай, кампазітара-ордэнаносца Гліера, кампазітара—дэпутата Вярхоўнага Совета БССР Туранкова і інш.

Юбіляраў віталі дэлегацыі ад совецкай інтэлігенцыі, ваеннаслужачых, піянераў і школьнікаў, прадстаўнікі Маскоўскай і Ленінградскай Дзяржаўнай кансерваторый.

Былы выхаванец школы, кандыдат музычных навук Л. Гінзбург прыпаднёс школе сваю першую музычную працу, школьнікі падаравалі партрэт таварыша Сталіна, вышыты на палатне.

Пад бурную авацыю было прынята пісьмо вялікаму другу совецкага мастацтва— таварышу Сталіну.

Я. ТАРАСАЎ.

Канцэртная брыгада на сяўбе

Менскі абласны аддзел па справах мастацтваў разам з Філармоніяй БССР арганізаваў канцэртную брыгаду для абслугоўвання калгасаў у часе вясенняй сяўбы ў раёнах Менскай вобласці.

У склад брыгады ўваходзяць вакалісты, танцоры, музыканты, чытальнікі і інш. На чале брыгады стаіць масавік. Брыгада выязджае ў калгасы ў сярэдзіне красавіка і за месяц дасць звыш 40 канцэртаў.

——o——

ХРОНІКА

◆ Камітэт па справах мастацтваў пры СНК СССР вылучыў для карціннай галерэі БССР рад карцін і скульптур. Сярод іх работы Сурыкава, Рэпіна, Айвазоўскага, Левітана, Крамскога, Шышкіна, Манізера, Лаўрава і іншых.

◆ Віцебскі абласны Дом народнай творчасці стварыў зводны хор з 500 чалавек, аркестр народных інструментаў з 250 чал. і духавы аркестр з 100 чал. Зводныя калектывы рыхтуюць святочную праграму да першамайскіх урачыстасцей.

◆ Удзельнікі калгаснага хора Княжацкага сельсовета Магілеўскага раёна ўзялі на сябе рад абавязацельстваў па лепшай падрыхтоўцы да Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі і дэкады беларускага мастацтва ў Маскве і выклікалі на соцыялістычнае спаборніцтва хор калгаса імя Літвінава Рэчыцкага раёна.

◆ Рэчыцкі Дом соцыялістычнай культуры стварыў канцэртную брыгаду для абслугоўвання калгаснікаў у часе вясенняй сяўбы. У брыгаду ўвайшлі харавы і музыкальны гурткі.

◆ У клубе фабрыкі імя Комінтэрна (Гомель) 3 красавіка адбыўся вечар, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння М. П. Мусоргскага. Вучні музычнай школы і студэнты музвучылішча выканалі ўрыўкі з опер «Хаваншчына», «Сарачынскі ярмарак» і рад камерных твораў.

◆ Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР і Саюз совецкіх архітэктараў стварылі камісію для адбору лепшых работ маладых архітэктараў БССР. Работы гэтыя будуць накіраваны на выстаўку маладых архітэктараў, якая адкрыецца ў Маскве ў маі.

◆ 6 красавіка ў Маскву выехала група беларускіх архітэктараў (тт. Брэгман, Воінаў, Варaксін, Столяр, Гусеў і інш.) для вывучэння метадаў скарaснога будаўніцтва.

◆ Вучні студыі выяўленчага мастацтва пры Магілеўскім абласным Доме народнай творчасці ўзялі на сябе рад абавязацельстваў па падрыхтоўцы да Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі і выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці» і выклікалі на соцыялістычнае спаборніцтва студыю выяўленчага мастацтва пры Доме народнай творчасці БССР.

Ю. ВІЦЬБІЧ

РЭПІН У БЕЛАРУСІ

«А я тут, у Здраўнёве, жыву самым першабытным жыццём, якім жылі яшчэ грэкі «Одысеі». Абрабляю хіба толькі зямлю з рыдлёўкай. Часта ўспамінаю Сізыфа, цягаўшага камні, і зайздрошчу цудам над Антэем. Ах, калі-б і ў мяне гэтае дакрананне да зямлі аднавіла мае сілы, якія ў Пецербургу ўвесь час парадкам гібелі».

І. РЭПІН. З пісьма В. В. Стасаву. Ліпень, 1892.

У тым годзе старыя плытагоны, праходзячы праз добра вядомы ім з маленства парог Закладзень, зірнуўшы на даўно знаёмы бераг, здзіўляліся:

— Мабыць палац, мабыць царкву, але нешта будуюць.

І, на ўсякі выпадак, хрысціліся на будову:

— Данамажы, божа, дайсці да Рыгі.

Бурлакі памыляліся. Будавалі не палац і не царкву, а майстэрню славутаму мастаку-гуманісту, які з невядомай раней нікому сілай паказаў увесь цяжар іхнага жыцця.

Атрымаўшы ў 1891 годзе за сваю карціну «Запарожцы» 35 тысяч рублёў, Рэпін купіў у Віцебскай губерні, на беразе Заходняй Дзвіны, маёнтак Здраўнёва.

«Купіў! І ў захапленні — прыгожы куток!.. Цяпер усе думкі там», — піша ён у маі 1892 года І. Р. Тарханаву пра жывапіснае Здраўнёва, ад'язджаючы разам з дзецьмі туды.

Адразу пачынаецца прыбудова к дому вежы-майстэрні.

Вакол Здраўнёва, у малазямельных вёсках Цякаве, Лушчысе, Аўсюкове жылі спадчынныя беднякі. Спярша яны падазрона аднесліся да новага памешчыка. Але неўзабаве падазронасць знікла: хударлявы, рухавы Рэпін нічым не паходзіў на бліжэйшых памешчыкаў-немцаў — Шнея і генерала фон-Віторфа. Просты ў абыходжанні, ён пры сустрэчах цёпла гутарыў з вяскоўцамі, заўсёды дапамагаючы беднякам. Часам да яго прыходзілі небаракі, абадраныя яшчэ больш за вяскоўцаў. Яны толькі-што пехатою вярнуліся з Сібіры, куды ездзілі шукаць шчасця, і цяпер прасілі пазычыць хлеба. Рэпін ніколі не адмаўляў ім, пазыка звычайна не варочалася, ды яе ніхто асабліва і не патрабаваў. Хутка ўся сярмяжная ваколіца добра ведала мастака Ільлю Ефімавіча Рэпіна, што жыў у доме з вежай.

Штогодна на Ільёў дзень усе гарапашнікі Цякава, Лушчыхі, Аўсюкова і больш далёкіх вёсак, апрануўшыся ў лепшую вопратку, ішлі ў Здраўнёва. Усяго іх там збіралася каля 300 чалавек. Напярэдадні на шырокім двары перад домам ставіліся ў некалькі радоў доўгія сталы. Рэзалася карова, а часам і дзве. Цяпер кухары разносілі па сталах мяса і хлеб, цягнулі ў вёдрах маласольныя гуркі і квашаную капусту, у кошыках — пернікі і цукеркі і нарэшце выкатвалі на сярэдзіну двара бочку з віном. Дзеці Рэпіна ўсаджвалі гасцей, якія пілі за здароўе імяніньніка. Рэпін, выходзячы на двор, дзякаваў усіх за ўвагу да сябе і, падымаючы бакал з сельтэрскай вадой, піў за здароўе сваіх гасцей.

— Ілья Ефімавіч, кіньце вы частаваць гэтых п'яніц! Навошта вам мужыкі? — гаварыў не аднойчы мастаку мясцовы поп, вельмі ўсхваляваны тым, што яго царква ў гэты святочны дзень заўсёды пуставала. Але Рэпін, хітравата зірнуўшы на шызы нос папа, нічога яму не адказваў.

Сярод гасцей былі цымбалісты і дудары. Пасля частавання чулася іх музыка, пачыналі танцы хлапцы і дзяўчаты, спявалі маладзіцы. А дзядзькі, рассеўшыся гурткамі і запаліўшы пінкі, пачыналі гутаркі. Ужо ўначы, калі крычалі пеўні, вяскоўцы, падзякаваўшы яшчэ раз гасціннага гаспадара, разыходзіліся па сваіх хацінах.

Запрашаючы сялян да сябе, Рэпін часта наведваў іх. На спраўленым ім вяселлі беднай дзяўчыны Насты Селіванавай ён быў за пасаджонага бацьку. Як кажуць, вяселле прайшло вельмі гучна. Спявалі вясельныя песні, ігралі безупынку музыканты, танцавалі — аж ходарам хата хадзіла — лявоніху, а пасаджоны бацька, седзячы ў ганаровым куту, расказваў, смеючыся, сватам і свацціям пра розныя здарэнні з свайго апошняга падарожжа ў Парыж.

Але асабліва запомнілася вяскоўцам вяселле Сцяпана Крывенкі, якое таксама, пачынаючы ад ботаў жаніха і канчаючы хусткай «княгіні», справіў Рэпін. Горш за Сцяпана ніхто ў ваколіцы не жыў, і ўсё-ж у ваколіцы ён быў самым жыццёрадасным дзяцюком. Досыць толькі ўбачыць славуты эцюд Рэпіна «Беларус», каб адразу пераканацца ў гэтым. Усё на ім, за выключэннем вопраткі, належыць Сцяпану — нечасаныя кудры, шырокі лоб, шчырая ўсмешка і нястомныя працавітыя рукі. Не цяжка спазнаць Крывенку і ў эскізе да карціны «Бітва Давіда з Галіяфам». Калі мастак пісаў гэты эскіз, магутны па свайму складу, зграбны дзяцюк стаяў аголены на беразе, трымаючы ў выцягнутай руцэ камень. У двух кроках ад яго бегла Дзвіна і шумеў Закладзень.

Вялікаму мастаку была арганічна ўласціва вялікая любоў да мастацтва і працы. Іменна адсюль, з Здраўнёва, паслаў ён Стасаву сваё вядомае хвалюючае пісьмо:

«Мастацтва я люблю больш за людзей, за блізкіх, за сяброў, больш за ўсякае шчасце і радасці жыцця нашага... Дзе-б я ні быў, чым ні забаўляўся-б, кім ні захапляўся-б, чым ні насалоджваўся-б, яно заўсёды і ўсюды ў маёй галаве, у маім сэрцы, у маіх жаданнях лепшых, патаемнейшых!».

Рэпіна амаль штодня бачылі ў навакольных вёсках з альбомам у руках. Шмат хто з сялян пазіраваў яму.

— Аж вочы адбірае, як добра мая прырода перададзена—заўважыў аднойчы мастаку адзін яго выпадковы натуршчык. А потым, больш уважліва разглядзеўшы сваё вочы на эскізе, шэптам дадаў: — Але толькі адкуль вы дазналіся, што гэта я летась у Койтаўскага пана пуню спаліў?

На адным з эскізаў можна ўбачыць матку Сцяпана Крывенкі, старую Мар'ю. Яна сядзіць за прасніцай і прадзе кужаль. Аднойчы, праходзячы праз Цякава, Рэпін заўважыў дзеда Ляксея Зайца, які стаяў каля сваёй хаты ў цяжкім задуменні, апусціўшы рукі. Так яго і напісаў мастак. Цяперашні калгаснік з арцелі імя Кірава, жыццёрадасны дзед Наўлюк Вераб'ёў, пазіраваў у свой час смяротна параненага для карціны «Дуэль» Стары рабочы Вярхоўскага вапнавага завода Макар Зайцаў разам са сваёй стрэльбай увекавечан мастаком у радзе эскізаў да карціны «На паляванні». Толькі для здраўнёўскіх карцін «Дуэль» («Даруйце») і «Казанне Кунцэвіча ў Беларусі» Рэпіным напісана больш за 40 эскізаў з навакольных сялян.

Мастака бачылі за працай не толькі ў вёсках, але і на дарогах, на полі, у лесе, на беразе ракі. Бачылі і ўдзень, і ўначы, і раніцой, і ўвечары.

«Ідзеш часам па лесе і нечакана ўбачыш яго, — успамінае праваднік плытоў праз парогі Васіль Карунны. — Сядзіць на паваленай перуном хвоі, рысуючы бярэзіну. Хутка, хутка бегае па паперы алоўкам. І вось ужо дрэва, як жывое. Здаецца, вецер на ім галіны гойдае лісцё дрыжыць».

Асабліва-ж любіў Рэпін Дзвіну, здраўнёўскі сад, Цякаўскі роў і Аўдзеявічаўскі бор.

«Паляцела над зямлёй павучынне, восень прышла, — расказвае Васіль Карунны. — Мы ў той час працавалі каля ракі, атаву касілі, і Рэпін таксама побач з намі працаваў. Перад ім стаіць яго дачка Вера і ў руках трымае пук кветак, а ён з яе карціну малюе. Мы часам спыняліся, каб косы палапаціць, а ён — ні разу».

Так стварaўся цудоўны «Асенні букет». Гэта прыгожая дзяўчына ў аліўкавай кофце і карычневым берэце, напісана на фоне Цякаўскага лугу і Дзвіны,— не толькі дачка мастака. Гэта сама маладосць, чаруючая сваёй прывабнасцю.

У Цякаўскім рове напісан Рэпіным партрэт другой яго дачкі, Надзежды Ільінічны, вядомы пад назвай «На сонцы». Трэба толькі зірнуць на здраўнёўскі сад, каб пераканацца, што іменна гэтыя старыя яблыні ў часы сваёй маладосці пазіравалі мастаку для пейзажа «Квітнеючыя яблыні». І варта толькі перад світаннем, калі пабяжыць па рацэ туман, пераехаць на яе другі бераг у Аўдзеявічаўскі бор і паглядзець вакол, каб зразумець, што вось тут нарадзіўся пейзаж «Усход сонца над Заходняй Дзвіной». А калі вам давядзецца трапіць у Здраўнёва ўначы і месяц пабудуе ад вас да сябе праз Дзвіну сярэбраны мост, тады вы адразу спазнаеце пейзаж «Месячная ноч»,— той пейзаж, убачыўшы які, вельмі хочацца жыць.

Вакол Здраўнёва жылі пераважна беднякі, але асабліва галавалі цякаўцы. Каб не памерці з голаду, яны пачалі капаць глыбокія ямы, ламалі ў іх амаль голаруч скалу-вапняк і апальвалі яе ў саматужніцкай печы. Рэпін спачатку арганізаваў нешта падобнае на грамадскія работы. Ён вырашыў забрукаваць каля Здраўнёва апаўзаючы бераг. Цякаўцы вазілі каменне, яны-ж і брукавалі бераг, атрымаўшы за сваю работу значна больш, чым прасілі кваліфіцыраваныя брукары. А потым аднойчы цякаўцаў запрасілі ў Здраўнёва. Калі беднякі прышлі, Рэпін правёў іх у сваю майстэрню і, рассадзіўшы пад эскізамі, у якіх яны пазнавалі самых сябе, сказаў:

— Вось што, суседзі. Вырашыў я пакінуць сабе сядзібу, а зямлю прадаць. Даведаліся нейкім чынам пра мой намер розныя кулакі і цяпер мне ад іх ратунку няма. Груганнём наляцелі. А я вырашыў прадаць зямлю толькі вам. Больш нікому.

Узрадаваныя цякаўцы купілі ў Рэпіна 80 дзесяцін зямлі па цане, значна меншай за тую, па якой ён сам купляў яе. Пасля гэтай куплі яны не зрабіліся заможнымі, але больш не галадавалі.

У тагочасным губернскім Віцебску, які з'яўляўся своеасаблівым канцлагерам яўрэйскай беднаты, жыў і працаваў мастак Ю. М. Пэн. Рэпін ведаў Пэна яшчэ раней, калі той вучыўся ў Акадэміі мастацтваў адначасова з Серавым і Врубелем. Цяпер ён наведаў мастака ў яго майстэрні. А потым, цёпла адзываючыся аб творчасці Пэна наогул, Рэпін з захапленнем гаварыў аб яго паасобных работах.

Апошні раз І. Е. Рэпін наведаў Здраўнёва ў 1900 годзе. Пасля тут жылі яго бацька, жонка і дзеці. Бацька мастака, Ефім Васільевіч Рэпін, былы чугуеўскі ваеннапасяленец і нікалаеўскі салдат, дзевяностагадовы дзед, якога сын ласкава называў «бацэнькай», тут у 1894 годзе і памёр. Непрыкметная магіла яго знаходзілася на недалёкіх Вярхоўскіх могілках. Яшчэ ў 1929 годзе тут жыла дачка Рэпіна, Тацьяна Ільінічна. Тут нарадзіліся праўнучкі мастака, якіх ён перад сваёй смерцю вельмі хацеў бачыць і просьба яго была адразу задаволена.

Прайшло з таго часу амаль 40 год, але дзяды добра помняць Рэпіна, заўсёды ўспамінаючы аб ім з любоўю і пашанай. Дом, у якім жыў мастак, цяпер не існуе, ён разабран яго сваякамі. Затое цалкам захаваўся сад і алеі — у іх не знойдзеш ні аднаго пня. Паасобку стаяць чатыры дубы, пасаджаныя самім мастаком. На беразе відаць сляды разбуранай імклівымі дзвінскімі крыгаходамі дамбы. Усё гэта належыць Здраўнёўскай пачатковай школе, у якой вучацца ўнукі Сцяпана Крывенкі, дзеці былых цякаўцаў, а цяпер калгаснікаў калгаса імя Леніна.

Сем год назад памёр Сцяпан Крывенка, у вобразе якога выдатнейшы мастак, вялікі сын вялікага рускага народа, ўяўляў сабе беларуса. Усё жыццё ён не вылазіў з нястачы і перад смерцю збіраўся ўступіць у ствараемы калгас. Цяпер нястача невядома знаёмым Рэпіну беларускім беднякам, іх дзецям і ўнукам. Калгасы прынеслі з сабой заможнасць і цягу да культуры. Акрамя пачатковых школ, у ваколіцы ёсць Вярхоўская няпоўная сярэдняя школа, дзе настаўнічае далёкі сваяк мастака. Цяпер ніхто не ламае голаруч упартую скалу-вапняк; поблізу ад Здраўнёва вырас вапнавы прыгажун-завод «Руба». Яго высокія вежападобныя печы змянілі ўвесь навакольны пейзаж.

Непазнавальна змянілася ўсё вакол, а таму аб Рэпіне, вялікім мастаку, тут ведае кожны — і стары, і малы, і дзед— калгасны вартаўнік, і ўнук — школьнік-піонер. Не хопіць часу, каб запісаць усе апавяданні аб ім. І нават здаецца, што калі грыміць Закладзень і шумяць дубы, яны таксама расказваюць аб неўміручай творчасці геніяльнага народнага мастака, які тут калісьці жыў і працаваў.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Менск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № Т—1264.